Літаратура і мастацтва

22 кастрычніка 2004 г. № 42/4279

У ноч з 13 на 14 кастрычніка 2004 года пайшоў з жыцця Герой Сацыялістычнай Працы, народны пісьменнік Беларусі, акадэмік Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, лаўрэат Дзяржаўных прэмій СССР, Беларусі, прэміі Саюзнай дзяржавы ў галіне літаратуры і мастацтва Іван Шамякін.

Памёр Іван ШАМЯКІН

Іван Пятровіч ШАМЯКІН

Беларуская літаратура панесла непапраўную страту. У ноч з 13 на 14 кастрычніка 2004 года памёр Герой Сацыялістычнай Працы, народны пісьменнік Беларусі, акадэмік Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, лаўрэат Дзяржаўных прэмій СССР, Беларусі, прэміі Саюзнай дзяржавы ў галіне літаратуры і мастацтва Іван Шамякін.

Іван Шамякін нарадзіўся 30 студзеня 1921 года ў вёсцы Карма Добрушскага раёна Гомельскай вобласці. Скончыў Гомельскі тэхнікум будаўнічых матэрыялаў і быў прызваны на службу ў рады Чырвонай Арміі. Прайшоў праз усю Вялікую Айчынную вайну.

Пасля дэмабілізацыі працаваў настаўнікам, вучыўся на завочным аддзяленні Гомельскага педагагічнага Інстытута імя В.І.Чкалава, скончыў Рэспубліканскую партыйную школу. У 1947 годзе быў прызначаны старшым рэдактарам Беларускага дзяржаўнага выдавецтва, затым — галоўным рэдактарам альманаха «Советская Отчизна». У гэтым жа годзе стаў членам рэспубліканскай пісьменніцкай арганізацыі.

Іван Пятровіч Шамякін — яркі прыклад пісьменніка-грамадзяніна, які свой вялікі талент прысвяціў служэнню Айчыне і беларускай літаратуры. Заслугі пісьменніка адзначаны шматлікімі дзяржаўнымі ўзнагародамі.

Мастацкія творы І.П.Шамякін пачаў пісаць падчас вучобы ў тэхнікуме. Знаходзячыся на фронце, супрацоўнічаў у армейскім друку. Адным з першых ён распрацоўвае тэму Вялікай Айчыннай вайны. У 1945 годзе апублікаваў аповесць «Помста» аб падзеях ваеннага ліхалецця. Усенародная барацьба супраць фашысцкіх захопнікаў стала тэмай і першага рамана «Глыбокая плынь», які быў высока ацэнены крытыкай і чытачамі. Пяру Івана Шамякіна належыць самы маштабны ў беларускай літаратуры твор аб вайне — пенталогія «Трывожнае шчасце» (1957—1965).

Пісьменнік заўжды трымаў руку на пульсе часу. Для сваіх твораў І.П.Шамякін выбіраў актуальныя пытанні, якія хвалявалі грамадства, з усім моцам таленту і абвостранага грамадзянскага пачуцця ўздымаў найважнейшыя сацыяльныя і маральна-этычныя праблемы сучаснасці. Раманы «Крыніцы» (1956), «Сэрца на далоні» (1963), «Снежныя зімы» (1968), «Атланты і карыятыды» (1974), «Вазьму твой боль» (1979) і іншыя кнігі ўвайшлі ў залаты фонд беларускай літаратуры. У творах Івана Пятровіча Шамякіна гарманічна спалучаюцца дынамічнае развіццё сюжэта, філасофскі аналіз жыццёвых праблем і глыбокае пранікненне ў псіхалогію чалавека.

Гэтак жа творча плённа і самааддана народны пісьменнік Беларусі Іван Шамякін працаваў і ў апошнія гады. Напісаныя ім аповесці «Слаўся, Марыя», «Пошукі прытулку», «Губернатар» сталі адметнай з'явай у развіцці сучаснай беларускай літаратуры.

Адначасова з нястомнай творчай працай Іван Пятровіч Шамякін ажыццяўляў актыўную грамадскую дзейнасць. У 1971—1985 гадах ён узначальваў Вярхоўны Савет БССР, неаднаразова выбіраўся дэпутатам Вярхоўнага Савета СССР і БССР, быў членам Цэнтральнага Камітэта Камуністычнай партыі Беларусі, старшынёй Беларускага камітэта абароны міру, займаў кіруючыя пасады ў Саюзе беларускіх пісьменнікаў.

Творчасць І.П.Шамякіна атрымала ўсенароднае прызнанне і любоў як у Беларусі, так і за яе межамі. Яго раманы, аповесці і апавяданні перакладзены на многія мовы. Па шэрагу з іх створаны кінафільмы і тэатральныя пастаноўкі.

Кнігі слаўнага сына беларускай зямлі, сапраўднага патрыёта Івана Пятровіча Шамякіна назаўжды ўвайшлі ў скарбніцу нацыянальнай культуры. Светлая памяць аб выдатным беларускім пісьменніку і цудоўным чалавеку навечна захаваецца ў нашых сэрцах.

А.Р.ЛУКАШЭНКА, С.С.СІДОРСКІ, Г.В.НАВІЦКІ, В.А.ПАПОЎ, У.Р.ЛАТЫПАЎ, М.У.МЯСНІКОВІЧ, У.Н.ДРАЖЫН, А.В.ПРАЛЯСКОЎСКІ, В.В.РУСАКЕВІЧ, Л.П. ГУЛЯКА, А.М.РАДЗЬКОЎ, А.С.ЯКАБСОН, М.Я.ПАЎЛАЎ, І.І.ВАШКЕВІЧ, А.М. НОВІКАЎ, М.І. ЧАРПІНЕЦ.

Будзем помніць светлае імя

Сэрца апякла нясцерпна балючая вестка — не стала Івана Пятровіча Шамякіна. Ад нас пайшоў талент сусветнага маштабу, грамадскі дзеяч, прынцыповы і надзвычай чулы чалавек. Ён выйшаў з народа, увабраў у сябе народны дух, мудрасць і стаў народным у сваёй шматграннай творчасці. Ён быў акадэмікам Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, Героем Сацыялістычнай Працы, лаўрэатам Дзяржаўных прэмій СССР і Беларусі.

Па сваёй прыродзе Іван Пятровіч Шамякін быў знакавай нацыянальнай асобай, надзвычай плённым і таленавітым творцам. Буйнейшыя вехі мінулага стагоддзя і праявы новага знайшлі адлюстраванне ў шматлікіх творах, што па сутнасці сталіся мастацкім летапісам эпохі, у якой нарадзілася, спасцігала свет, праходзіла праз нялёгкія выпрабаванні і на шляхах ваеннага ліхалецця, і ў мірны аднаўленчы час цэлае пакаленне нашых суайчыннікаў. Яго таленавітыя кнігі "Глыбокая плынь", "У добры час", "Крыніцы", "Агонь і снег", "Трывожнае шчасце", "Сэрца на далоні", "Снежныя зімы", "Атланты і карыятыды", "Петраград — Брэст", "Вазьму твой боль" і шмат якія іншыя — неацэнны ўклад у нацыянальную літаратуру. Ягоныя героі, як атланты і карыятыды з аднайменнага рамана гожа, надзейна, вечна трымаюць храм нашай духоўнасці на сваіх волатных плячах.

Беларускае кнігавыданне Іван Шамякін узбагаціў не толькі ўласнымі творамі. Дванаццаць гадоў ён узначальваў выдавецтва "Беларуская энцыклапедыя". Пад яго кіраўніцтвам было завершана выданне 5-томнай кароткай энцыклапедыі "Беларуская ССР" на беларускай і рускай мовах, 5-томная "Энцыклапедыя прыроды Беларусі", 5-томная "Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі", 6-томны бія-бібліяграфічны энцыклапедычны слоўнік "Пісьменнікі Беларусі", аднатомныя энцыклапедычныя выданні "Скарына і яго час". "Янка Купала", а таксама энцыклапедыі "Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне", "Археалогія і нумізматыка Беларусі", "Этнаграфія Беларусі" і шмат якія іншыя. Пры ім распачата выданне гісторыка-дакументальных хронік "Памяць".

Нямала Іван Пятровіч зрабіў для беларускай літаратуры і журналістыкі, працуючы галоўным рэдактарам альманаха "Советская Отчизна" — папярэдніка цяперашняга рускамоўнага часопіса "Нёман". Ён быў частым госцем на Беларускім тэлебачанні і радыё і як аўтар вядомых п'ес і сцэнарыяў, і як пісьменнік, і як выдатны публіцыст.

На жаль, не вечнае чалавечае жыццё, але справы і ўчынкі — гэта тое, што застаецца нам як неацэнная спадчына. Яна ўзвышае наш дух, асвятляе нас, дапамагае ладзіць жыццё. Гэтым ён і застанецца для нас вечным. І мы заўсёды будзем з удзячнасцю помніць светлае імя — Івана Пятровіча Шамякіна.

Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь

Чатырнаццатага кастрычніка 2004 года на 84-м годзе жыцця пасля цяжкай і працяглай хваробы памёр народны пісьменнік Беларусі, акадэмік НАН, Герой Сацыялістычнай Працы Іван Пятровіч Шамякін.

Беларускі народ добра знаёмы з творчасцю Івана Пятровіча Шамякіна. Сярод лепшых яго твораў — раманы «Глыбокая плынь», «Сэрца на далоні», «Атланты і карыятыды», «Вазьму твой боль», «Трывожнае шчасце», гістарычны раман «Петраград—Брэст», «Злая зорка» і інш. Па многіх ягоных раманах знятыя мастацкія фільмы.

Дзяржава высока ацаніла творчую і грамадскую дзейнасць І. П. Шамякіна. Светлая памяць аб выдатным пісьменніку, сыне і патрыёце сваёй Радзімы Іване Пятровічу Шамякіне назаўсёды захаваецца ў памяці нашага народа.

Саюз беларускіх пісьменнікаў. Беларускі літаратурны фонд.

Развітанне

Дзень пагодны
самотай аплакан,
Сонечна чысты,
слязу пралівае.
Іван Пятровіч Шамякін
Праспектам Скарыны
У вечнасць сваю адплывае.

Труну па-дзяржаўнаму годна
Ганаровая варта
нясе з асцярогай.
Адыходзіць пісьменнік
народны
Апошняй зямною дарогай.

Абапал скрушнай
дарогі гэтай,
Што ў віратоку імкнецца
пад хвоі,
Прайшоўшы дымныя
вёрсты свету,
Устала эпоха – яго героі.

Душой пазнаю,
як іх, ссамочаных, густа
У плыні нясноднай,
выхадцаў простых з народу.
Душой прызнаю,
што на зямлі застанецца
не пуста
Пасля Яго адыходу.

Застануцца – магутныя
хвалі Духу –
Кнігі Яго несмяротныя.
Стань сейбіту
на стагоддзі пухам
Зямля родная.

Мікола МЯТЛІЦКІ

Памяці Івана ШАМЯКІНА

Вядомы ты усёй краіне,
Сваім прызнаў цябе народ.
Мы глыбіню
"ГЛЫБОКАЙ ПЛЫНІ"
Яшчэ даследуем штогод.

У дні ваеннага нянасця
За Беларусь прыняў ты бой,
Заўсёды жыў
"ТРЫВОЖНЫМ
ШЧАСЦЕМ"
На агнявой перадавой.

Жыў ты нялёгка,
ды ў пашане,
І межаў ёй нідзе няма.
Смуткуюць сёння
ДАБРУШАНЕ
І вёска родная КАРМА.

У душы тваёй
заўжды іскрыцца
Святло людскіх
адвечных мар.
Твае гаючыя "КРЫНІЦЫ"
Прымаем як бясцэнны дар.

Гарачых летаў,
"СНЕЖНЫХ ЗІМАЎ"
Абрыс у вечнасці не знік:
Бібліятэку кніг пакінуў
Нястомны, рупны
працаўнік.

Паўлюк ПРАНУЗА
14.10.2004 г.

Вечныя постаці

Памяці Івана ШАМЯКІНА

Адыходзіць эпоха
З іх імёнамі,
славай.
І радзее, як лес,
На атлантаў дзяржава.

Мележ...
Танк...
Вось Шамякін...
Адплываюць апошнія
Песняры у чаўнах —
Краю вечныя постаці.

Яўген ХВАЛЕЙ

Падчас развітання з народным пісьменнікам Беларусі Іванам Шамякіным

Исполком Международного Сообщества Писательских Союзов глубоко скорбит в связи со смертью участника Великой Отечественной войны, выдающегося писателя современности, народного писателя Белоруссии, Героя Социалистического Труда, лауреата Государственных премий СССР и Белоруссии, видного государственного и общественного деятеля Ивана Петровича ШАМЯКИНА.

Его имя широко известно, его романы, повести переведены на многие языки народов мира. Он был яркой, незаурядной личностью. Как истинный патриот и честный человек, бесконечно любил свою Беларусь, советскую власть, Советский Союз и тяжело переживал все случившееся в последние годы — распад СССР и великой советской литературы, которую сам достойно представлял.

Его смерть — невосполнимо горькая утрата для литературы и всех читателей.

Светлая память об Иване Петровиче Шамякине надолго сохранится в сердцах его друзей.

Передайте наши глубокие соболезнования родным и близким Ивана Петровича.

Сергей Михалков, Юрий Бондарев, Михаил Алексеев, Мустай Карим, Давид Кугультинов, Арсений Ларионов, Егор Исаев, Шавкат Ниязи, Валентин Сорокин, Ренат Мухамадиев, Исхак Машбаш, Абдижамил Нурпеисов, Мумин Коноат, Анар, Феликс Кузнецов, Алесь Кожедуб, Владимир Фомичев, Лариса Жарова, Леонид Ханбеков.

Глубоко скорбим вместе с Вами о кончине выдающегося белорусского писателя Ивана Петровича Шамякина.

С 50-х годов получили всесоюзную известность его книги о минувшей войне и о белорусской деревне. Его романы "Глубокое течение", "В добрый час", "Криницы", "Сердце на ладони" и многие другие, а также сборники повестей и рассказов вошли в золотой фонд советской литературы. Они переводились на языки народов СССР и в зарубежных странах. Народность, правдивость, художественная пристрастность к образу человека-труженика, воина, нравственно здорового и преданного своей Родине, были близки и понятны читателям самобытной, художественно яркой шамякинской прозы...

Склоняем головы в скорби. Сердечно переживаем вместе с Вами тяжелую утрату. Родным и близким, потерявшим дорогого Ивана Петровича, наши особые соболезнования.

Председатель Правления
Союза писателей России В. Н. ГАНИЧЕВ

У імкненні да гармоніі

Пайшоў ад нас у лепшы свет харошы чалавек, таленавіты пісьменнік Іван Пятровіч Шамякін, аўтар шматлікіх твораў у розных жанрах, але найбольш абазнаны як раманіст. Цяжка адразу, з ходу ацаніць усё зробленае ім. Асабліва я люблю ранняга Шамякіна. Яго «Глыбокая плынь» была адной з першых кніг пра вайну, якія я прачытаў у сваім жыцці. Доўга не мог уцяміць, як гэта паняцце «плынь» стасуецца са зместам твора і што яно азначае. Разуменне прыйшло пазней, пад агульным уплывам творчай канцэпцыі пісьменніка, якога цікавіў, думаецца, у аднолькавай ступені як асобны чалавек, так і агульная супольнасць — «плынь», народ, грамадства ў яго вырашальных накірунках і якасцях. Сваёй творчасцю, мне здаецца, ён імкнуўся гарманізаваць узаемадачыненні і ўзаемаадносіны чалавека і народа, чалавека і дзяржавы. Асабліва выразна гэта відаць у такіх раманах, як «У добры час», «Крыніцы», «Сэрца на далоні», у цыкле «Трывожнае шчасце». Чалавек у Шамякіна шукае ўзаемаразумення з дзяржавай, з навакольным светам, шукае, як і сам пісьменнік, гармоніі, ці, як цяпер кажуць, кансенсусу, абараняючы гуманістычныя каштоўнасці — душэўную далікатнасць, чуласць, спагаду. Гэтым пафасам прасякнуты такія яго рэчы, як «Атланты і карыятыды», «Снежныя зімы», «Вазьму твой боль» і інш. І нават творы 90-х гадоў з вострай крытыкай антыгуманістычных з'яў у нашым грамадстве. За гэта яго і любіў дэмакратычны чытач.

Гэта быў вялікі жыццялюб і нястомны працаўнік. Пісаў шмат і з насалодай.

Чалавек чулага сэрца і высакароднай душы, шчодра адораны дабрынёй і шматгранным талентам, Іван Шамякін пакінуў глыбокі след у беларускай літаратуры. Яго багатая мастацкая спадчына — неад'емная частка нашай культуры і духоўнасці, без чаго немагчымы мэтанакіраваны рух у будучыню, вартую чалавека. Створаныя ім велічныя мастацкія вобразы заўсёды будуць жывіць і натхняць творчыя здзяйсненні тых, хто ідзе і пойдзе далей.

Бывай, Іван Пятровіч! Хай пухам будзе для Вас наша беларуская зямелька!

Уладзімір ГНІЛАМЁДАЎ

Страта

Кінематаграфісты роднай яму кінастудыі ведалі, бадай што, больш за астатніх пра цяжкую хваробу і мужнасць пісьменніка-франтавіка, з якой ён змагаўся за жыццё. Марнелі сілы, іх ужо не ставала, каб паехаць на месцы здымак і сустрэцца з супрацоўнікамі творчай групы яго апошняга фільма-экранізацыі рамана "Снежныя зімы", якую гэтымі восеньскімі днямі з асаблівым імпэтам ажыццяўляюць рэжысёры-пастаноўшчыкі М.Касымава і І.Паўлаў. Слабы голас у тэлефоннай трубцы падбадзёрваў, бласлаўляў працу. Вельмі ўражвала, што ён выдатна памятаў асобныя эпізоды з рамана, прасіў захаваць у сцэнарыі ўзаемасувязі герояў, не рабіць іх трафарэтнымі. "У прастаце праўда, сціпласць і абаяльнасць, у нешматслоўнасці — мужнасць".

На жаль, не паспелі мы паказаць яму кінапробы. Фільм пачаў свой шлях. І ўжо артысты новага пакалення — ягоныя ўнукі — увасабляюць вобразы, створаныя фантазіяй і талентам гэтага незвычайна цягавітага працаўніка літаратуры. Сярод кінематаграфістаў распаўсюджана думка, што кіно спрыяе папулярызацыі літаратурнага твора. У выпадку ж з Іванам Шамякіным якраз наадварот: у такой ступені былі папулярнымі і вядомымі чытачам ягоныя раманы і аповесці, што яны ўжо дапамагалі, рабілі фільму рэкламу.

Супрацоўніцтва распачалося даўно, бо пісьменніка з кінематаграфістамі звязвала саракагадовая плённая праца. Менавіта ў 1964 годзе рэжысёр І.Шульман першы экранізаваў раман "Крыніцы". Вядома, што пісьменнік быў адным з лепшых майстроў сюжэта сярод празаікаў свайго пакалення. Гэта не магло не прываблiваць кінематограф, які любіць сюжэт і ставіць яго на першае месца. Але апроч сюжэта пільны погляд пісьменніка, веданне жыцця сучаснікаў дапамагалі Івану Пятровічу ствараць запамінальныя характары. Было што іграць артыстам, было што рабіць рэжысёрам. Ягоныя творы ахвотна экранізавалі цяпер ужо вядомыя майстры рэжысуры М.Пташук, А.Карпаў, І.Дабралюбаў, В.Нікіфараў. Вось назвы фільмаў, якія зрабіліся гонарам беларускага кінематографа: "Вазьму твой боль", "Хлеб пахне порахам", "Шлюбная ноч", "Эпілог". Да творчасці Івана Шамякіна звярталіся і масфільмаўцы. У гэтых фільмах запомніліся вобразы, створаныя Ул. Гасцюхіным, І.Мацкевічам, Ул. Самойлавым, В. Белахвосцікам, Н. Андрэйчанка. Былі створаны выдатныя фільмы і на беларускім тэлебачанні. Даводзілася чуць ад рэжысёраў і артыстаў, што сцэнарны матэрыял пісьменніка не патрабаваў дапрацоўкі, ён быў натуральны, лёгкі і пераканаўчы ў дыялогах, не выклікаў пратэста ў артыстаў сваёй штучнасцю і балбатнёй на зададзеную ідэалагічную тэму. Іван Пятровіч перажываў усе страты і дасягненні, радасці і гора свайго народа і эмацыянальна пераносіў гэта праз сваіх герояў на экран. Фільмы, пастаўленыя па ягоных творах, запатрабаваныя і ў XXI стагоддзі. Іх ахвотна паказваюць па тэлебачанні, значыць, ён меў рацыю: трэба шукаць у народзе добрае, не губляць маральнага апірышча, адлюстроўваць герояў, на якіх хацелася б быць падобнымі. Цягам апошніх гадоў кола яго інтарэсаў пашырылася: пісьменнік захапіўся гісторыяй Беларусі, вытокамі хрысціянскай маралі. Ён пісаў апантана, нервова, нават непрымірэнча, абараняў сапраўдныя чалавечыя каштоўнасці.

Беларускія кінематаграфісты шчыра смуткуюць з нагоды смерці народнага пісьменніка Беларусі, свайго калегі Івана Пятровіча Шамякіна, добрага чалавека, які нідзе і ніколі не прыніжаў і не выказваўся негатыўна пра творчасць сваіх калег, аберагаў іх, бо ведаў цану слову і пісьменніцкай працы. Сёння мы кажам: "Бывай, дарагі Іван Пятровіч". Ён схіляўся перад жанчынай-маці, умеў пісаць жаночыя характары і Бог даў яму памерці ў дзень Пакроваў і пайшоў ён ад нас пад апеку Божай Маці.

Георгій МАРЧУК,
галоўны рэдактар
кінастудыі
«Беларусьфільм»

Рабочы момант здымак фільма па рамане І. Шамякіна "Вазьму твой боль". Рэжысёр-пастаноўшчык М. Пташук і актрыса С. Станюта

Летапісец свайго краю

Памяці народнага пісьменніка Беларусі, незабыўнага баявога сябра-франтавіка — Івана Пятровіча ШАМЯКІНА

Калі магла на полі бою
Патрапіць куля проста
ў скронь, —
Ты ўвагі не звяртаў
на тое —
Якога колеру агонь:
Чырвонай ён ці чорнай
фарбай
Гарэў і звонку і знутры.
Ты толькі бачыў —
твой абшар быў
світальным колерам зары.

Сцяг баявы
над полем рэяў,
А бой да ночы не сціхаў.
Сваёй зенітнай батарэяй
Яго ты ў небе калыхаў.

Ты адчуваў усёй душою,
Што ў тым няма
тваёй віны,
Што многія сябры
з табою
Не стрэліся пасля вайны...
Мы ўсе спазналі
жахаў многа
І на вайне й пасля яе.
Вяртала дальняя
дарога
Дамоў нас у краі свае.

Ты зноў адчуў тут
у даліне,
Як бор навейвае
спеў-сон,
І цеплыню глыбокай
плыні,
Якую нёс у мора
Сож.
Душа прымала
ўсё святое,
Чым жыў і дыхаў
твой народ.
І ў кнігах стала
явай тое,
Што сам выношваў
многа год.

Пятро ПРЫХОДЗЬКА
14 кастрычніка 2004 г.

Вернасць

Быў час, быў век, была эпоха...

Да гэтых агульнавядомых радкоў "Сказа пра Лысую гару" я, з нагоды апошняга юбілею Івана Пятровіча, дадаў на сяброўскай вечарыне і свой уласны: "...і, дзякуй Богу, ёсць Шамякін".

Няўмольны час перарабіў гэты мой радок, але я паўтараю яго зноў і зноў, бо сэрца аніяк не хоча змірыцца з тым, што зафіксаваў розум, не хоча, адмаўляецца мяняць "ёсць", на "быў". Цяжка змірыцца са стратай свайго добрага і даўняга сябра, свайго "аднадумца і аднадомца", як вызначыў на памянёнай вечарыне Іван Курбека (парадныя вокны нашых кватэр не адно дзесяцігоддзе глядзяць на спакойную плынь Свіслачы), не хочацца прыняць горкую праўду таго, што ўжо аніколі не зойдзеш да свайго суседа, не ўбачыш ягоныя мудрыя вочы, не пачуеш нетаропкі і спакойны голас, у якім ніколі не было гневу, раздражнёнасці, а толькі чуласць, сардэчнасць, спагада, жаданне дапамагчы, вера ў тое, што нягоды заўсёды мінаюць...

Але гэта — асабісты боль, горыч свайго ўласнага сэрца. А побач з гэтым болем — боль вышэйшы, боль Беларусі, нацыі, народа, зямлі беларускай, якая страціла Чалавека, веліч якога не толькі мы, людзі нашага Сёння, але і новыя і новыя пакаленні шчэ будуць спасцігаць і асэнсоўваць.

Факты і лічбы гісторыі — гэта толькі каркас эпохі, а сутнасць яе, жывую і непаўторную плоць складаюць дзве існасці: слёзы людскія і радасць людская. І захаваць іх для нашчадкаў неба даверыла пісьменніцкаму сэрцу, вырубіўшы на ім нязгасны запавет: што б ні здарылася, пісьменнік павінен сумленна рабіць сваю справу, бо калі змоўкне літаратура, — гэта роўна пагібелі ўсяго народа.

Да гэтага запавету ён дадаў і свой асабісты, вызначыўшы свой жыццёвы дэвіз гранічна проста: "...ва ўсім і заўсёды быць верным. Верным народу, справе, жонцы, дзецям, сябрам. Верным ідэі, якую выбраў сваёй пуцяводнай зоркай".

Аксакал, патрыярх беларускага мастацкага слова быў верны гэтаму жыццёваму выбару кожнае імгненне свайго жыцця, нібыта паўтараючы тое, чым жыла душа выдатнага паэта, рускага класіка: "Я смеялся, и плакал, и пел, и за этою странной забавой оглянуться на жизнь не успел". У мастацкі летапіс эпохі, які стварыла і стварае беларускае мастацкае слова, шамякінскія літаратурныя творы, плён той "странной забавы", склаліся ў трывалы і трапяткі ланцуг, усе звенні якога зіхацяць гэтак жа, як зіхаціць на сонцы бурштын, што адшліфаваны і абцалаваны марской хваляй.

Вобразамі сваіх твораў ён смяяўся гэтак жа шчыра, як смяюцца шчаслівыя бацькі, забаўляючыся з дзеткамі на лугавіне каля сваёй хаты, збудаванай уласнымі рукамі; з ядучым сарказмам смяяўся з урвіцеляў і прайдзісветаў, прадажнікаў, нягоднікаў з чорнымі душамі; плакаў, калі пісаў пра дым беларускіх хат, у якіх жыўцом гарэлі бацькі разам з дзеткамі, калі маляваў вобразы маладзенькіх зенітчыц, якім быў за камандзіра; радасна спяваў, ствараючы ўзнёслую сагу будаўнікам, што ставілі новае жытло на месцы спаленых гітлераўцамі гарадоў і вёсак.

Ягоны сябра і паплечнік па літаратурнай справе, што жыў у суседнім доме, напісаў у адным з сваіх вершаў: "Кідаюць людзі Радзіму, гнуцца пад небам чужым. Чым жа не дагадзіла? Альбо пакрыўдзіла чым? Што ж іх так вабіць за светам? Думак ці спраў кірмаш? Кажуць: другое паветра, дома — такога няма".

Нікому з нас нават і ў дурным сне не сасніцца Шамякін "пад небам чужым". Ён быў да канца адданы сваёй роднай зямельцы і небу над ёй. І таму гэтак верылі чытачы творам свайго сапраўды народнага пісьменніка, верылі той дабрыні, мужнасці і велічы чалавечага духу, што струменіць са старонак ягоных кніг. Дабрыня і празарлівасць яго мастацкіх вобразаў вызначылі лёс не аднаго пакалення, жывілі, умацоўвалі і ўмацоўваюць сілавое поле духоўнасці нашага народа, ляжаць непахіснымі гранітамі ў інтэлектуальным падмурку нашага беларускага дома. Ім, гэтым гранітам — цудоўным шамякінскім творам, — намаляваных сэрцам патрыёта і змагара, — ляжаць вечна ў тым падмурку, побач з іншымі маналітамі велічы чалавечага духу, бо яны назапасілі толькі светлыя памкненні людскія, спапяляюць тую атруту, якой спрабуюць сёння выпаліць з нашых сэрцаў памяць пра тое добрае, чым жыла і жыве зямля Беларусі, што шчодра палітая слязьмі гора і радасці.

І яна, гэтая зямля, зямелька наша беларуская, будзе табе, Мой Дарагі Дружа, спагаднай і мяккай заўсёды.

Алесь САВІЦКІ
15 кастрычніка 2004 г.

Сапраўды: незабыўны і народны...

Помню, у школе аб'явілі, што ў наш гарадок, а гэта была Бяроза на Брэстчыне, прыязджаюць пісьменнікі, і што мы, дзеці, будзем удзельнічаць у сустрэчы з імі. Я тады была ў другім ці ў трэцім класе, многія дэталі ўжо і не помняцца, але помню букеты кветак, з якімі мы сустракалі пісьменнікаў на ўездзе ў горад, помню паўнюткую залу раённага Дома культуры і запомніліся два прозвішчы з той вялікай пісьменніцкай дэлегацыі: Міхась Лынькоў і Іван Шамякін...

Я была дзяўчынкаю ўражлівай, схільнай да фантазій, але, каб тады мне хто-небудзь сказаў, што ў далейшым жыцці, некалі ў мяне не толькі будуць сустрэчы, тэлефонныя размовы з Іванам Пятровічам, але што Ён самым непасрэдным чынам прыме ўдзел у маім літаратурна-жыццёвым лёсе, у такое, безумоўна, я не змагла б паверыць. Але лёс — рэч выключна непрадказальная, ды я не пра яго, а пра Івана Пятровіча, бо калі пасля заканчэння Маскоўскага літаратурнага інстытута апынулася з накіраваннем у Мінску, самае невырашальнае вырашыў Ён — Іван Пятровіч Шамякін. Пытанне было нялёгкае: не магла ўладкавацца на працу, таму што не было мінскай прапіскі, і наадварот — без пастаяннага месца працы, як і дзе прапісацца?! Ён паверыў тады ў мяне, у мае літаратурныя здольнасці і, дзякуючы толькі Яму аднаму, жыллёвыя метры я атрымала ў цэнтры Мінска, а з імі і прапіску, і працу ў штотыднёвіку "Літаратура і мастацтва"...

У Бібліі напісана, што таму, хто стукаецца, трэба заўсёды адчыняць. Іван Пятровіч быў Божым чалавекам, Ён адчыняў многім, многім і многім, Ён спрыяў, Ён дапамагаў, Ён падтрымліваў, пішучы сваю самую галоўную кнігу — Кнігу ўласнага жыцця, па законах душы і сэрца. Тымі часамі, калі Іван Пятровіч быў адным з кіраўнікоў нашага творчага саюза, мы — маладыя, адчуваючы і ўвагу да сябе, і падтрымку, неаднойчы гаварылі паміж сабой, маўляў, нашы класікі — франтавікі, яны прайшлі праз такую страшную вайну, яны перамаглі, выстаялі, вярнуліся са сваіх франтавых дарог, ведаюць кошт і цану жыцця, таму і душы ў іх адкрытыя, шырокія, таму і плячо гатовы падставіць, і засцерагчы, і затуліць, калі трэба, а найперш вучылі літаратуры і жыццю ў ёй. Яны мацавалі нашу пісьменніцкую сям'ю, і колькі свайго жыццёвага вопыту аддаў гэтаму мацаванню Іван Пятровіч! Нам патрэбна была Яго жыццёвая мудрасць, мы тэлефанавалі Яму, ішлі да Яго па параду і Ён шырока расчыняў не толькі дзверы сваёй кватэры, але і сваё мудрае сэрца. І як часта апераджаў, віншуючы з тым, ці іншым святам, чаго ўжо даўно не робяць нават творцы-аднагодкі. "Ну як, Рая, пішацца?" — распачынаў з гэтага пытання ці не кожную гаворку і прызнаваўся, што шмат нараджаецца ў яго самога сюжэтаў, а вось рукі ўжо не слухаюцца, пальцы не трымаюць ручку. Тыя сюжэты Ён забраў з сабою, пакінуўшы нам, усяму нашаму народу свае кнігі, тое, што нараджаў ягоны Талент, а яшчэ была Кніга Яго жыцця — пісьменніка, класіка, Чалавека і напісаць яе патрэбна нам, у думках зазіраючы ў Яго мудрыя вочы, у якіх свяціліся не толькі адказы на многія з'явы і рэчы, але былі і пытанні, на якія Ён шукаў адказу і не знаходзіў, сапраўды, чаго творцы варагуюць адно з адным?

Ён застанецца незабыўным на ўсё далейшае жыццё да скону, і будзе помніцца, як ішлі і ішлі людзі, шмат людзей, тысячы і тысячы, каб аддаць апошні паклон вялікаму пісьменніку сваёй зямлі. Я міжволі вачамі шукала нашу творчую моладзь і ў думках дзякавала тым з іх, маладым, хто прыйшоў аддаць і пашану, і павагу. Яны, як і тыя, хто па нейкай прычыне не змог прыйсці, павінны ведаць, на пачатку свайго творчага шляху, што Беларусь развіталася з Творцам, які не проста меў званне народнага, а быў сапраўды народным, у нашым, у сваім жыцці і часе.

Астатняе ўсё за будучыняй.

Раіса БАРАВІКОВА

Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова "Літаратура і Мастацтва" глыбока смуткуе з прычыны смерці народнага пісьменніка Беларусі Івана Пятровіча Шамякіна і выказвае шчырае спачуванне родным і блізкім нябожчыка.

Рэдакцыя штотыднёвіка "Літаратура і мастацтва" смуткуе з прычыны смерці народнага пісьменніка Беларусі, аднаго з пастаянных аўтараў і выказвае сардэчныя спачуванні родным і блізкім.

Мінская пісьменніцкая арганізацыя смуткуе з прычыны смерці народнага пісьменніка Беларусі Івана Пятровіча Шамякіна і выказвае шчырыя спачуванні родным і блізкім нябожчыка.

Калектыў Дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры смуткуе з прычыны смерці народнага пісьменніка Беларусі Івана Шамякіна і выказвае шчырыя спачуванні родным і блізкім.

Выдавецтва "Мастацкая літаратура" смуткуе з прычыны смерці народнага пісьменніка Беларусі Івана Шамякіна і выказвае спачуванні родным і блізкім нябожчыка.

Калектыў часопіса "Полымя", смуткуючы разам з усёй Беларуссю, выказвае глыбокае спачуванне родным і блізкім Івана Пятровіча Шамякіна з выпадку вялікага гора — смерцю выдатнага пісьменніка.

Палымянцы падзяляюць вялікае гора, якое напаткала супрацоўніцу часопіса, унучку Івана Пятровіча Шамякіна Марыю Вячаславаўну Кудрашову.

Рэдакцыя часопіса "Нёман" глыбока смуткуе з прычыны смерці народнага пісьменніка Беларусі Шамякіна Івана Пятровіча і выказвае глыбокія спачуванні родным і блізкім нябожчыка.

Калектыў Дзяржаўнага літаратурнага музея Янкі Купалы глыбока смуткуе з прычыны смерці народнага пісьменніка Беларусі І.П. Шамякіна і выказвае шчырае спачуванне яго родным.

Кафедра беларускай літаратуры XX стагоддзя Беларускага дзяржаўнага універсітэта смуткуе з прычыны смерці народнага пісьменніка Беларусі Івана Пятровіча Шамякіна і выказвае глыбокія спачуванні яго родным і блізкім.

Калектыў часопіса "Маладосць" смуткуе з усёй Беларуссю і выказвае глыбокае спачуванне родным і блізкім Івана Пятровіча ШАМЯКІНА. Ён адышоў у іншы свет, але памяць па ім — з намі.

Супрацоўнікі Літаратурнага музея Петруся Броўкі смуткуюць з прычыны смерці народнага пісьменніка Беларусі Івана Пятровіча Шамякіна і выказваюць шчырае спачуванне родным нябожчыка.

Супрацоўнікі выдавецтва "Беларуская энцыклапедыя", рэдакцыйная калегія глыбока смуткуюць з прычыны смерці народнага пісьменніка Беларусі, былога галоўнага рэдактара выдавецтва Івана Пятровіча Шамякіна і выказваюць шчырае спачуванне яго родным і блізкім.

Кафедра беларускай лінгвістыкі і міфалогіі БДУ смуткуе з прычыны смерці народнага пісьменніка Беларусі І.П. Шамякіна і выказвае глыбокае спачуванне дачцэ, доктару філалагічных навук, прафесару Таццяне Іванаўне Шамякінай, родным і блізкім у сувязі з вялікім горам.



Амаль дзевяноста працэнтаў насельніцтва рэспублікі прыняло ўдзел у рэферэндуме і выбарах народных дэпутатаў 17 кастрычніка. 77,3 працэнта з іх прагаласавала за прапанову беларускага Прэзідэнта. Абрана сто сем дэпутатаў са ста дзесяці...

«Голас народа — голас Божы»

Сухія лічбы, а колькі за імі думак, разважанняў, спадзяванняў! Так, так, як не найперш — спадзяванняў, падмацаваных дзесяцю гадамі нялёгкай, напружанай працы, якая пачала ўжо прыносіць вынік, бачны не толькі вонкава, агулам, але і кожным з нас. Кожным — асабіста, у яго асабістым жыцці. І ў чым бы гэта ні выяўлялася — у чарговым, планавым павышэнні заробку ці пенсіі, ва ўзрослых сацыяльных дапамогах, стыпендыях ці грантах для таленавітай моладзі (а гэта ж нашы дзеці і ўнукі!), у паступовасці і неадменнасці змен ва ўсім акаляючым жыцці — ні аспрэчыць, ні, тым больш, абвергнуць набытае, напрацаванае за прамінулыя гады немагчыма.

І якімі ж мізэрнымі, нікчэмнымі бачацца на гэтым фоне стваральнай мірнай працы дробныя звады і "натхнёныя" доларавымі ўліваннямі выпады тых, каму няймецца дапяць да ўлады — тут і цяпер. Гледзячы на каторага з іх, так і хочацца ўсякі раз спытаць: а што вы, галубы, атрымаўшы ўладу, зрабілі б — не для сябе, не для сваіх гаспадароў, а для народа? Ну, пэўна ж, пакрасаваліся б перад усім светам тыдзень-другі, паклоны сваім "натхніцелям" адбіваючы, а далей? Якія прапануюцца праграмы? Якія вехі бачацца на шляху развіцця дзяржавы? Які кірунак жыцця народа? Захадам вызначаны? Падкінуты нячыстымі на сумленне "ястрабамі" ад палітыкі, што карыстаюцца еўрапейскімі ці амерыканскімі клішэ, якія і ў Еўропе ці ЗША часта не спрацоўваюць? "Дэмакратычны", як чуем мы скрозь і адусюль? Але ж дэмакратыя — гэта (у перакладзе з грэчаскай) улада народа ў сваёй дзяржаве, а не ўлада аднаго народа над усімі астатнімі, як вынікае з палітыкі ЗША, з іх палітычнага курсу на "сілавое" ўвядзенне ў любой краіне свету (па іх выбары) с в а і х норм жыцця, с в а й г о разумення права і правоў чалавека, с в а і х імперскіх эканамічных інтарэсаў. Гэта і даводзіць сёння нікому не трэба: варта ўзгадаць трагічныя падзеі ў Югаславіі, развязаную амерыканцамі вайну ў Афганістане і Іраку...

Гэткай будучыні для Беларусі прагнулі і прагнуць спадары "апазіцыянеры"? Дык жа не было і не будзе паіхняму! Прайшоўшы рэферэндум — таму бясспрэчнае пацвярджэнне.

І наўрад ці сабраў бы дзень выбараў дэпутатаў у новы склад беларускага парламента столькі людзей на выбарчых участках, наўрад ці назіралася б такая актыўнасць выбаршчыкаў, калі б не былі вынесены на рэферэндум жыццёва важныя для кожнага з нас пытанні: якой мы жадаем бачыць будучыню сваіх дзяцей і ўнукаў? у якой меры давяраем лёс гэтай будучыні абранаму намі Прэзідэнту?

Так, так, менавіта такія, хоць і іначай сфармуляваныя пытанні, на якія сэрцам трэба было адказваць і адказаць! І абыякавых, раўнадушных ні ў горадзе, ні на вёсцы не было. Ні да рэферэндуму, ні ў часе галасавання, ні пасля. Сведчаннем — хоць бы той факт, што найбольш скаргаў пачало паступаць пасля таго, як зачыніліся выбарчыя ўчасткі: званілі, скардзіліся на няўвагу да сябе тыя, хто па стане здароўя не мог прыйсці прагаласаваць самастойна і чакаў членаў выбарчай камісіі дома...

Што ж, кожны лічыў сваім абавязкам прыняць удзел у рэферэндуме, таму што вынік яго закранаў кожнага. І вынік не мог быць іншым — гэта ясна. Марна сёй-той палохаў беларускую і замежную грамадскасць нічым не абгрунтаваным, бессаромным прагнозам, што выніковыя лічбы пасля падліку бюлетэняў будуць абавязкова сфальсіфікаваны, што народ (па ўсіх гэлапаўскіх апытаннях гэтак выходзіла!) спіць і бачыць "рэжым звергнутым". Ды што з іх возьмеш! Даўно сказана: хто мае вочы, той бачыць, хто мае вушы, той чуе... Не бачаць, як з дня ў дзень мяняецца да лепшага жыццё? Не чуюць голас народа, якім хочуць "кіраваць"? Гэта іх праблемы. Наш народ заўсёды сам — самастойна, без дарадцаў з Захаду ці Усходу — вырашаў і вырашае свой лёс, свой шлях, дамагаючыся на гэтым шляху відочных для ўсіх (нават для нядобразычліўцаў) поспехаў. І мы па праве можам гэтым ганарыцца перад усім светам.

Не заўважаць ці, тым больш, адрэчваць тое, што, па словах лаўрэата Нобелеўскай прэміі дэпутата Дзяржаўнай Думы Расіі Жарэса Алфёрава, толькі "дзякуючы тытанічнай рабоце Прэзідэнта, Беларусь аказалася сярод рэспублік былога Саюза, якая не дала разрабаваць агульнанародную ўласнасць і не толькі захавала, але і павялічыла эканамічны патэнцыял прамысловасці і сельскай гаспадаркі", немагчыма. Ні сябру, ні нядобразычліўцу.

Пацвярджэнняў гэтым словам шмат. Прывяду толькі адно: калі яшчэ некалькі гадоў таму прадпрыемствы рэспублікі бралі ў банках крэдыты, каб вырашаць толькі надзённыя праблемы заробку, занятасці рабочых, закупкі сыравіны ці камплектуючых, то сёння крэдытаванне ідзе пад рэалізацыю буйнамаштабных праектаў, скіраваных на ўкараненне прагрэсіўных тэхналогій і складанага тэхналагічнага абсталявання. Ці ж гэта — не паказчык поспеху, паспяховага развіцця эканомікі? Поспеху, які ўплывае на жыццё кожнага працоўнага калектыву, кожнай сям'і, кожнага чалавека — і ўплывае самым непасрэдным чынам (праз заробак ці пенсійнае забеспячэнне, праз рост дабрабыту і добраўпарадкаванне зямлі і гарадоў, гарадкоў і вёсак).

І, думаецца, семнаццатага кастрычніка не толькі ўлада, не толькі Прэзідэнт прымалі своеасаблівы экзамен перад сваім народам, а і народ — усе мы! — трымалі экзамен перад сваімі нашчадкамі. Экзамен на самастойнасць думкі, на самастойнасць выбару, калі адусюль гучалі самага рознага кшталту адозвы і заклікі, а далёка за акіянам нават прымаліся пагрозлівыя заявы і акты. Экзамен на моц нашай веры ў таго, каго мы абралі сваім Прэзідэнтам, даверыўшы яму лёс сваёй краіны. Экзамен на разуменне, на свядомае прызнанне таго шляху, якім ідзе сённяшняя Беларусь. Гэты экзамен мы, беларусы, з годнасцю вытрымалі — і я, як кожны з тых, хто аддаў свой голас за Беларусь, не хаваю радасці. Радасці і гонару.

І што б хто сёння ні гаварыў, паскульваючы ці падбрэхваючы сваім незадаволеным гаспадарам, любому ясна: гэта — перамога. Перамога праўды над хлуснёю, якая столькі часу ліецца на нашу краіну — на нас — то з Захаду, то з Усходу. Перамога розуму, разумнага разважання — над ілюзіяй паабяцанага "заходняга раю". І гэта важна. Важна, я ўпэўнена, не адно для Беларусі. Бо калі аналітыкі сёння пішуць: "зараджанасць на негатыў, якая заўважалася ў асобных каментарыях прадстаўнікоў місіі АБСЕ, на жаль, пацвердзіла, што ў адносінах да Беларусі прымяняюцца двайныя стандарты, двайныя падыходы", то ці ж толькі для Беларусі яны прымяняліся, — хочацца спытаць, — ці ж толькі сёння?

У народзе дасціпна зазначаюць: нельга прычасаць усіх за раз адным грабянцом, бо ці каўтун саб'ецца, ці грабянец зламаецца... Дасціпна і мудра. Любая людская суполка, любы саюз дзяржаў трымаецца не на клішэ, адных і тых жа для ўсіх, а на агульначалавечых, агульнарэлігійных каштоўнасцях. І чым хутчэй палітыкі (і народы, якія да іх прыслухоўваюцца) зразумеюць гэта, тым больш шанцаў у сусветнай супольнасці на мірнае, годнае для ўсіх жыццё — заўтра і давеку.

Шмат каго мы выслухалі за апошнія дні, тыдні — і слухалі, нават не пагаджаючыся, а то і абураючыся сказаным, паважліва, як і належыць людзям з шырокім светапоглядам і ўласнай годнасцю. Мы проста зналі: рашэнне за нас ніхто прымаць не будзе. Ды і не дазволілі б мы!

Як кожны чалавек пражывае сваё жыццё, зжывае свой лёс, штодня, штохвіліну робячы пэўны выбар паміж тым ці іншым учынкам, паміж тым ці іншым рашэннем, гэтак жа і кожны народ жыве сваім жыццём, вершыць свой лёс, будуе сваю будучыню. І калі паўстае перад народам выбар, якім шляхам ісці, каму ў той ці іншы перыяд даверыць кіраўніцтва дзяржаваю, ніхто не можа застацца ўбаку, ніхто не павінен рабіць за яго гэты выбар. Мы, беларусы, неаднойчы пацвярджалі сваю годнасць, сваю здольнасць абыходзіцца без "дарадчыкаў" (замежных і сваіх) і свядома, не зважаючы ні на чый уціск, прымаць выверанае ўласным вопытам рашэнне. Абышліся без "падказак" і семнаццатага кастрычніка, усім народам прыняўшы рашэнне, прагаласаваўшы за Беларусь, за яе годную будучыню.

Што ж да прынятага сенатам ЗША "Акта аб дэмакратыі ў Беларусі" — "сенатараў многа, а Беларусь адна", як адказаў аднаму з заангажаваных журналістаў Уладзімір Пуцін. Беларусь — адна, Беларусь — наша Айчына, наш агульны дом, і мы выбралі: быць ёй моцнай і квітнеючай, незалежнай ад чужой сілы і чужых капіталаў. І як сказаў Патрыярх Маскоўскі і ўсяе Русі Алексій II: "Нас не можа не радаваць эканамічны рост, які ажыццяўляецца ў Беларусі. Кожны раз бываючы ў вас, я бачу паляпшэнне жыцця. Дай Бог, каб гэта развіццё мацавалася і надалей на карысць беларускага народа і Беларусі, якая мае важнае значэнне, знаходзячыся на шляху з Захаду на Усход".

Што можна дадаць да сказанага і пажаданага?

Таіса БОНДАР

“Выбарчая кампанія была арганізавана і прайшла ў прававым полі”, — адзначалі наглядальнікі.



Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка прыняў удзел у рэспубліканскім рэферэндуме і выбарах дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу.

Першым на выбарчы ўчастак № 125 г. Магілёва прыйшоў член БРСМ, студэнт 4-га курса Беларуска-Расійскага універсітэта Сяргей Нікіфараў.

Наглядальнік парламенцкага сходу Саюза Беларусі і Расіі Сяргей Бабурын.

Ідзе галасаванне ў Магілёве.

Прэс-канферэнцыя старшыні Цэнтрвыбаркама Лідзіі Ярмошынай.

Адным з першых прагаласаваў ветэран вайны Іван Давыдавіч Томахаў.

Падвядзенне вынікаў галасавання на Гродзеншчыне.

Адметны дзень календара

17 кастрычніка, як вядома, адбыліся рэспубліканскі рэферэндум і выбары ў Палату прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь. Настаў, як кажуць, час падвесці вынікі гэтай значнай падзеі, якая вырашала далейшы лёс краіны.

Эканомна

Вядома, што на правядзенне падобных мерапрыемстваў выдзяляюцца грошы з рэспубліканскага бюджэту. На правядзенне сёлетняй выбарчай кампаніі было выдаткавана амаль 13 мільярдаў рублёў. З іх 79,6 працэнта пайшло на аплату працы ўчастковых і акруговых выбарчых камісій. Каля 12,5 працэнта спатрэбілася на матэрыяльнае забеспячэнне выбараў, г. зн. на выпуск спецыяльнай літаратуры, падпісных лістоў, бланкаў і да т.п. Па 50 базавых велічынь атрымалі ад Цэнтрвыбаркама на лістоўкі і плакаты ўсе кандыдаты ў дэпутаты. Конкурс на атрыманне дэпутацкага мандата склаў у сярэднім 3,2 чалавека на месца. У выніку, калі ў асобных акругах спатрэбіцца паўторнае галасаванне, праблем не будзе — выдаткі зараней запланаваныя бюджэтам і складаюць 30—40 працэнтаў ад выдзеленых сродкаў. Пры гэтым у Цэнтрвыбаркаме паведамілі, што нягледзячы на тое, што выбары вельмі і вельмі дарагое мерапрыемства, усё-ткі нашым суграмадзянам абыходзіцца казне танней, чым у многіх іншых краінах, — менш долара на кожнага выбаршчыка.

Што тычыцца рэферэндуму, ён «запатрабаваў» 400 мільёнаў рублёў. Большая частка сумы — 270,2 мільёна пайшла на аплату працы членам тэрытарыяльных выбарчых камісій. 129 мільёнаў выдаткавалі на матэрыяльна-тэхнічнае забеспячэнне рэферэндуму.

Чыноўнікам удалося сэканоміць дзяржаўныя сродкі, аб'яднаўшы два мерапрыемствы: выбары і рэферэндум — у адно. Прыводзіцца лічба: эканомія склала 151 мільён рублёў.

Нас, дарослых — 7 мільёнаў

Была агучана лічба: на Беларусі 7 мільёнаў выбаршчыкаў. У параўнанні з выбарамі дэпутатаў мясцовых Саветаў мінулага года гэтая лічба зменшылася на 135 тысяч. На тое ёсць свае аб'ектыўныя прычыны.

Сярод выбаршчыкаў — і нашы суайчыннікі, якія жывуць за межамі Беларусі. У 32 краінах свету было сфармавана 40 участкаў для 7,5 тысяч чалавек (што стаяць на консульскім уліку). Дарэчы, толькі ў маскоўскіх ВНУ навучаюцца каля 3-х тысяч студэнтаў з беларускім грамадзянствам. Таму лічба ў 7,5 тысяч павялічылася, бо прымалі ўдзел у галасаванні ўсе, хто завітваў у нашы пасольствы, маючы на руках пашпарты грамадзян Беларусі.

Самы сучасны Інфармацыйны цэнтр

Як вядома, бясконцы паток інфармацыі сцякаўся ў ЦВК з камісій двух узроўняў — з тэрытарыяльных, якія займаліся арганізацыяй рэспубліканскага рэферэндуму і з акруговых, што забяспечвалі парламенцкую выбарчую кампанію. Галоўным месцам на многія гадзіны стаўся Інфармацыйны цэнтр Цэнтральнай камісіі па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў, які знаходзіўся ў Палацы Рэспублікі. Менавіта тут працавала асноўная частка як айчынных, так і замежных журналістаў, а таксама некаторыя міжнародныя назіральнікі.

Па словах старшыні Цэнтрвыбаркама Лідзіі Ярмошынай, дзякуючы самай сучаснай тэхніцы, якой аснасцілі гэты цэнтр, дэмакратычна і своечасова адсочваліся дадзеныя пра яўку на выбарчыя ўчасткі, а таксама падводзіліся першыя папярэднія вынікі.

Інфармацыя паступала па трох каналах, пры гэтым усе дадзеныя як бы дубліраваліся: па факсе, электроннай пошце і праз дзяржаўную сістэму сувязі.

Наш кар.

Таіса МЕЛЬЧАНКА

Вяртанне

Вось гэты край даўно яго
ўжо клікаў,
Бо сына не хацеў свайго губляць.
І ён вярнуўся —
непадкупны Быкаў,
На родную зямельку паміраць.

У вочы смерць заўсёды зазірала,
А ён і з мёртвых колісь уваскрэс.
Балюча аб вайне пісаў нямала,
Ішоў няпраўдзе ўсёй наперарэз.

Калі падчас душа яго крычала,
Цярпення пазычаў ён у Хрыста.
Таму яна наўколенцы не стала,
А з годнасцю ўжо ў нашыя ўрасла.

І за ўпакой душы
згарае свечка...
Дух непакорай
узлятае зноў.

Ён — несмяротны!
Ён — заўсёды вечны!
Бо заслужыў народную любоў.
Ягоны воблік зліўся ўжо з іконай
І будзе Беларусь зноў блаславяць.
І хоць яна збяднела на імёны,
Вярнуўся Быкаў, каб не паміраць!

Час бедстваў

Стыхійных бедстваў
надыходзіць час:
Патопішчы, пажары,
землятрусы.
Прырода ўжо папераджае нас...
Успомніце пра Бога,
беларусы!

За спінамі даўно гарбы грахоў:
Адступніцтва, бяспамяцтва
і здрада.
Да мовы роднай выгніла любоў.
У падчарках хадзіць яна не рада.

Ужо рабамі сталі вы чужой,
Не рэжуць слых ні словы,
ані гукі.
Крыж бездухоўны несяцё вы свой
Без сораму,
раскаяння і мукі.

Нябачна, мо,
пранёсся дзікі шквал,
Пераламаў,
перакрышыў святыні.
Гісторыі нялёгкі перавал
Адолее не кожны да вяршыні.

Ён дрэва роду долу люта гнуў,
Імкнуўся нават вырваць з каранямі,
Ды адступіў.
Бяссілле тут адчуў,
Бо спадчына здавён стаіць за намі!

Яна — бяссмерце,
соль маёй зямлі!
Таму перажыву ўсе сэрцатрусы.
Каб неба не шпурнула камяні,
Успомніце пра Бога,
беларусы!

Матчына песня

Я не забуду, маці як спявала!
Была жаданай песня за сталом.
То радасцю, то сумам спавівала
Маю душу.
Ляцела над сялом.

Раздольная, гучала без прынукі
Пранікліым клічам
спадчыннай крыві.
Глыбока западалі ў сэрца гукі,
Дух беларускі мудрасцю жывіў.

Той песні ўжо ўлілася ў мяне сіла,
Распальвала агонь любві святой.
Гісторыю да донца варушыла,
Вяла па родным краі за сабой.

Ці не таму тады я заспявала?
А сёння ж адгалоску ўжо няма.
Баліць Айчыне —
безгалосай стала.
Як паланянка,
хоць і без ярма.

Ды я настырна,
мамачка, спяваю,
Вышэйшу ноту зноў імкнуся ўзяць.
Твая душа з нябыту выплывае.
Я адчуваю:
хоча падтрымаць.

Яшчэ збяру вялікае застолле,
І ты нябачна сядзеш ля мяне.
І з намі пра жаноцкую нядолю
Маўклівая Айчына запяе.

* * *

Стала іншай...
Ёсць на то прычына.
Кажуць,
што змяніўся і пагляд.
Як у адзінокай стаў жанчыны —
Сумны ў спёку, ў дождж,
і ў снегапад.

Ты адзін душы маёй патрэбны.
Адляцеў жа рана так чаму?
Срэбнай зоркай ззяеш у паднеб'і.
Бесцялеснай без цябе жыву.

Жорны мукі мелюць несціхана
Боль яшчэ нявыплаканы мой.
І душа, як нажавая рана.
Мо, таму і стала я другой.

Стала іншай...
Шкадаваць не трэба,
І душа штодня мацней баліць.
Між зямлёй цяпер яна і небам —
Да цябе, рыдаючы,
ляціць...

Анатоль ШУШКО

Весні матыў

На зямлі, дзе я жыву,
Сонейка высвечвае
Рунь зялёную, траву,
Што вітае в е ч н а е.

На зямлі, дзе маеш быць,
Дзе табе вяселіцца,
Трэба праўдай даражыць,
Што табою дзеіцца.

На зямлі, дзе ты жывеш,
Каранішся, множышся,
Вер усім, каго завеш —
Разам з імі гожышся.

Дык вышэй, брат, галаву!
Д'ябал хай не следуе.
Пра зямлю, дзе я жыву,
Адно с о н ц а ведае.

* * *

земляку-суседу,
паэту Міколу Антаноўскаму

Вясна!
Адшчыравалі капяжы.
Адсіверыла снежная завея.
На плот чапляе маці гладышы,
Бо выган утрапёна муравее.

Вясна у кожным лецінькім лістку,
У роснай позве, каб святлом
жаданым
Душа сябе зазначвала ў радку,
А сэрца — у камлі тваім, Сташаны.

Майскаму ранку дома на ганку

Зноў ты ў пошуку з'яднаўся
З навізной, з наступствам,
Каб мой дух пераканаўся,
Што жыццё — не глупства.

Што яно ўва мне буяе
Крэўнасцю трывалай.
Гэта ж: рае і спрыяе
Весці рэй з Купалам!

Мой ты светлы,
Мой ты гожы,
Май мой сакавіты!
Мкні праз гразь і бездарожжа,
Раз вясной наліты.

Дзякую

Як рознасцежна мне ў жыцці!
Якая сіла пачуцця,
Якая прага адкрыцця,
Які магутны сэнс быцця
Закладзены ў Табе, мой Божа!

Вятроў дыханнем дзеі множыш,
Дажджмі-слязьмі параіць можаш,
Вачыма кветак раніш гожа,
Каб Слова-сэрца не маўчала:
Спявала,
верыла,
гучала,
Здзіўлялася і аздабляла,
Гаіла,
веціла,
крыляла,
Крынічыла і векавала...

Дык дзякую Табе, Ўсяўладны,
За шчодрасць, за прымус ашчадны,
За тое, што заўжды в ы с о к і:
І блізкі,
і такі далёкі.

Санет яднання

Вас двое у мяне — Ты і Яна.
Не кожны гожы мець такое шчасце,
Каб ён і да вытока мог прыпасці
І акунуцца ў рэчышча да дна.

Пакуль душу спатольвае вясна
У пацалунку шчодрага прычасця,
А сэрца рвецца языкамі жарсці:
Вас двое у мяне — Ты і Яна.

Вас двое у мяне — Яна і Ты —
Лябёдкі дзве жаночай пекнаты.
І боязна мне, страшна памыліцца!

Каб, скрушнаму, не ўсведамляць тады,
Як адцвітуць гады, нібы сады,
Што мог на еднасць Вашую маліцца.

Лёля БАГДАНОВІЧ

Сумна...

Зноў не заснула да ранку...
Трэба адвесіць фіранкі.
Выпіць гарбаты хоць кубак.
Сумна без губ тваіх, любы.

Сонейка лашчыць праз шыбы.
Але раўня табе хіба
Промняў халодныя крылы
Сумна без рук тваіх,
мілы.

Цісне мароз за сцяною.
Услед палячу за табою.
Будуць свяціць мне і ўночы
Зоркамі любыя вочы.

Праганю тваю хваробу

Маршчасты лоб, сівыя скроні.
У шурпатых мазалях далоні.
Ці ж гэта ты, мая матуля?
У зрэбнай беленькай кашулі
Ляжыш на ложку нерухома.
З табой такой я незнаёма.
Ты ўсё жыццё кудысь імчала.
Табе ўсё часу не хапала.
Шчэ ўчора бегала па хаце
У старэнькім латаным халаце.
Зваліла ўсё-такі цябе стома...
Ледзь-ледзь даклыпала да дома.
У хаце, як заўсёды, чыста.
Фіранкі свежасцю празрыстай
Пад подых ветрыка гуляюць.
І вокны, нібы вочы, ззяюць.
А на падлозе можна есці.
Памыла, мо, разоў ты дзвесце
Пакуль мяне к сабе чакала.
Дык вось і я. Вітай. Прымчала.
Прэч праганю тваю хваробу.
Няма чаго спраўляць жалобу.
Лепш пойдзем, набяром чарніцаў.
Надзенем боты, рукавіцы,
Ды крапіву парвём ля плоту —
Тут непачаты край работы.
У мамы пасвятлелі вочы.
Ўдваіх шчабечам да паўночы.
Яна ажно памаладзела,
Нібы вясну сваю сустрэла.
Як вожык, тупае па хаце
Ў сваім залатаным халаце...

Адчай

Я вып'ю з рук тваіх атруту,
Нібы свянцоную ваду.
І скінуўшы зямныя путы,
На неба зоркай узыду,

Дзе Млечны Шлях ляжыць
спрадвечна.
Пануе холад і спакой,
Душа мая, нібыта свечка,
Гарыць над хатаю тваёй.
Я буду берагчы, каханы,
Твой палахліва-прагны сон.
Пакуль не завітае ранак,
І не разбудзіць росны звон....

Мелодыя верша

На скрыжаванні дабрыні і злосці
Ты нарадзіўся, мой гарэзны верш.
І рэхам бесклапотнай маладосці
Нага ў нагу паўсюль за мной ідзеш.

Гаючыя пра маму успаміны.
Кахання горыч, роспач і журба.
Ружовыя каралі журавінаў.
Рамонкаў яснавокіх варажба.

Паданні сівізны дубоў спрадвечных.
Азёраў і вачэй тваіх блакіт.
За ростанямі новыя сустрэчы.
І пошчак салаўіны ля ракі.

Маланкава-вясёлкавае лета,
Сузор'яў хараство, палёт чмяля,
Я буду зноў і зноў пісаць пра гэта.
Ляці у свет, мелодыя мая.

Стрэл на змярканні

Малым, амаль адзічэлым яго злавіў недзе ў лесе Кандрат Лантух.

Шчанё было хілае, нязграбнае. Вялікая, аблавухая галава, перахлябісты, ледзь не прысохлы да хрыбетніка жывот ды рыжая, аблезлая поўсць, з-пад якой выпіралі адны косці.

Знясіленае — мусіць, не адзін ужо дзень бадзялася без прытулку, — яно ледзьве трымалася на нагах. Толькі вочы — глыбокія, сінія — гарэлі пранізлівым, злым агнём.

Дадому Кандрат прывёў яго на папружцы. Маўклівае, бездапаможнае, яно пакорліва плялося ззаду. На двары гаспадар развязаў павадок і ткнуў шчанё нагою ўбок:

— Ну ж, халера!..

Шчанё самотна і баязліва прыціснулася да плоту. І толькі пачуўшы пах ежы, ажывілася, падышло да вялізнага свінячага карыта, якое стаяла пасярод двара, прагна пачало вылізваць рэшткі мяшанкі.

Жонка, сухая, маршчыністая, як і Кандрат, кабеціна, убачыўшы шчанё, забубніла пад нос:

— Прысунуў... здыхоцце нейкае. На якую яно табе халеру? Каб што хоць людскае, а то? Нехта разумны выкінуў, дык ён...

— Сціхні ты! — хмура абарваў яе Кандрат і, памаўчаўшы, дабавіў:

— Знойдзецца яму работа. Не памяшае на двары. А шчанё пароды неблагой.

Лантух не памыліўся ў сваіх прыкметах. Ужо праз паўгода нязграбнае, змардаванае шчанё ператварылася ў рослага, здаровага, з густой калматай поўсцю сабаку. Штодзённая муштра, цяжкі, пакутлівы ланцуг, на якім яго трымалі дзень і ноч, яшчэ больш развілі ў ім прыродную злосць.

Сабака стаў зверам. Ашчэрыўшы пашчу, з якой сцякала пена, ён рваўся да кожнага, хто заходзіў на двор і не супакойваўся, пакуль гаспадар уладарна не прыкрыкваў на яго:

— Рэкс! У будку!

Суседзі, якія і раней рэдка заходзілі да Лантухаў, цяпер іх двор пачалі абмінаць зусім.

Пад восень сабаку прывязвалі ў садку. Вялізныя, нібы жоўтыя гладышыкі, смачныя грушы і пахучыя ружовабокія яблыкі пачыналі прываблiваць вясковых падлеткаў. Цэлым роем віліся яны, ледзь толькі цямнела, вакол высокіх Кандратавых платоў.

Раней гэта дастаўляла Лантуху нямала клопату. Як ужо ні стараўся ён пільнаваць свой садок — начэй не дасыпаў, стрэльбай, зараджанай соллю, палохаў — усё роўна праклятыя падшыванцы ўмудраліся, з-пад рукі, можна сказаць, цягнуць яго "жывую капейку". Раніцай, тупаючы вакол аблатошанай яблыні альбо грушы, яму толькі прыходзілася са злосцю сплёўваць:

— Каб вас парвала ўжо, плойма ненажэрная!..

Цяпер гаспадар мог не трывожыцца. Ні адзін, нават самы адчайны "садоўнік" не адважваўся пералезці Кандратаў плот, за якім, бразгаючы ланцугом, кідаўся азвярэлы Рэкс. Некаторыя, праўда, паспрабавалі былі напачатку, але рызыка не апраўдалася: назад смельчакі вярнуліся з разарванымі калашынамі і пакусанымі лыткамі.

Лантух быў задаволены. Нарэшце-такі трапілася яму тое, чаго так доўга хацелася. Ёсць і ў яго неблагі сабака. На людзях жа, калі часам пыталіся, навошта ён трымае такога звяругу, хмура адказваў:

— Сабака як сабака. Дзела сваё знае.

Аднойчы, як звычайна, на досвітку, Кандрат прачнуўся і выйшаў на двор. Звычка ўставаць да сонца засталася ў яго яшчэ з тых даўніх дакалгасных часоў, калі трэба было да снедання паспець пакарміць і напаіць сваю шматлікую жывёлу.

Касалапа валюхаючы, ён пашукаў каля хаты, падабраў на сцежцы некім надкушаны яблык, зазірнуў у хлеў, зноў прайшоўся па двары і адчуў, што сёння тут чагосьці не хапае.

"Рэкс, — здагадаўся Кандрат і нахмурыўся. — Ляжыць недзе, ваўкарэзіна".

Але ў будцы сабакі не было. Не было яго і ў садку. На канцы дроту самотна звісаў ланцуг, а побач з ім на траве валяўся разарваны ашыйнік.

Жонка, калі ён сказаў аб прапажы, загугнела:

— Я так і знала. Выгадаваў заразу. Толькі харчу дарэмна колькі зглумілі. Свінню можна было б укарміць... Казала ж табе...

— Казала, казала... — агрызнуўся Кандрат. — Нідзе не задавіцца, прыйдзе.

Рэкс вярнуўся на трэці дзень. Прыціхлы і самотны, ён ляжаў каля будкі. Густая рыжая поўсць была пашкуматана, акрываўлена і ссохлася ў кавалкі. Разарваныя вушы віселі крывавымі шматкамі. Заплюшчанае правае вока моцна апухла. Левае было шырока, ненатуральна адкрыта, і сінь, у глыбіні якой раней палаў агонь, памутнела, сачылася слязою.

Кандрат доўга і хмура стаяў над сабакам. Аб нечым думаў.

За вячэраю жонка спытала:

— Што ты з ім будзеш рабіць?

Зіновій ПРЫГОДЗІЧ

Ён прамаўчаў. Уткнуўся ў міску, старанна жаваў капусту.

Яна адказала сабе сама:

— А тое й рабіць!.. Які з яго толк цяпер? Паўгода лячыць давядзецца...

Кандрат моўчкі даеў капусту, выцер тоўстыя губы рукавом і нетаропка ўстаў з-за стала. Скруціў тоўстую самакрутку, пыхнуў сівым дымам і, зняўшы са сцяны стрэльбу, узяўся за клямку.

— Я зараз...

Праз колькі хвілін на гародах, спалохаўшы цішыню, бухнуў глухі, кароткі стрэл.

Грошы

Аркадзь сустрэў мяне радасна, шумна:

— Го-го-го, сусед! Колькі зім, колькі летаў! Здароў, здароў...

Ён падышоў бліжэй і, пільна аглядваючы мяне з галавы да ног, паляпаў па плечуку:

— А ты, брат, змяніўся. Сустрэў бы дзе ў горадзе — не пазнаў. Чуў я, ты ў Мінску вучышся ў інстытуце. Ну, ну, давай цісні. Можа, у вучоныя праб'ешся.

— Кінь ты, Аркадзь, — махнуў я рукою, адчуваючы, што чырванею. — Не так гэта лёгка. Раскажы лепш, як ты жывеш, дзе працуеш. Як-ніяк, пяць гадоў не бачыліся.

— Ну пра гэта пасля. А цяпер давай прысаджвайся да стала. Прыезд трэба замачыць!

Я паспрабаваў быў запярэчыць, што не трэба ніякіх пачастункаў, што зайшоў проста так, пабачыцца, пагаварыць, але Аркадзь рашуча перапыніў мяне:

— Толькі без размоў! Будзь мужчынам. А я зараз гукну старую, хай чаго-небудзь збярэ нам.

І Аркадзь, пстрыкнуўшы пальцамі па горле і па-змоўніцку падміргнуўшы мне, выйшаў у сенцы.

Неўзабаве ўсё такая ж, колькі я помню, рухавая, панура-маўклівая цётка Зося, Аркадзева маці, ставіла перад намі міскі з агуркамі, шаткаванаю капустай, парэзаным на скрылі салам, патэльню з падсмажаным колцам свойскай каўбасы. Аркадзь дастаў з кішэні пляшку самагонкі, адаткнуў самаробны з газеты корак, наліў мутнаватай вадкасці ў шклянкі.

— Ну, за прыезд — і твой, і мой!

— За сустрэчу.

Выпілі, закусілі. Я адразу адчуў, як у галаве закружылася — самагонка была моцная, гналі, відаць, для сябе. Ад другога заходу давялося адмовіцца. Аркадзь выпіў сам. Паставіў шклянку, выцер танклявымі пальцамі губы.

— А ты, значыць, не п'еш? Не навучыўся ці, можа, не хочаш са мною?

— Не крыўдуй, калі ласка. Ты ж ведаеш, які з мяне піток... Да таго ж адразу пасля сесіі...

Прыкметна пасалавелыя вочы Аркадзя глядзелі на мяне не то са здзіўленнем, не то з недаўменнем.

— Ну, ну... Маўчу.

Ён адвёў позірк убок, задумаўся. Доўгія, кашчавыя пальцы дробна заскакалі-забарабанілі па стале. У куточках губ прамільгнула насмешліва-скептычная ўсмешка.

— Маўчу, маўчу... — паўтарыў ён ціха і, залажыўшы рукі за галаву, адкінуўся назад, да сцяны.

Нейкі час невідушча глядзеў на мяне, як бы прыслухоўваючыся да нечага свайго, глыбіннага, а пасля рэзка наваліўся грудзьмі на стол, загаварыў горача, страсна, нібы працягваючы нейкую даўнюю, балючую спрэчку.

— Інстытуты, сесіі, шмесіі... Усё гэта, канечне, добра. Толькі скажу я табе, дарагі мой сусед, ніякія інстытуты, ніякія акадэміі не зробяць нікога чалавекам, калі ён не ўмее жыць. Разумееш, жы-ыць!.. Ты думаеш, я такі ўжо граматны ці проста шчасліўчык, што працую загадчыкам буйной базы? Чорта з два! З дыпломамі засыпаліся, не адзін па шапцы атрымаў, а я — працую. А чаму? Ды таму, што перш за ўсё трэба ўмець жыць.

Аркадзь зноў прыхінуўся да сцяны, глядзеў на мяне моўчкі, дапытліва. Маўчаў і я. "Пра якое ўменне ён гаворыць? З чаго б гэта?"

Рыпнула табурэтка. Аркадзь устаў, не спяшаючыся дастаў цыгарэту, закурыў. Глыбока, са смакам зацягнуўся.

— За гэтыя пяць гадоў, — загаварыў ён ужо больш спакойна, разважліва, — я шмат дзе пабываў, шмат чаго пабачыў. І скажу, дарагі мой сусед...

Аркадзь зрабіў паузу, глыбакадумна калыхнуўся на мысках сваіх мадэльных туфляў і прадоўжыў:

— Скажу, што жыццё, брат, — складаная штука. Яно далёка не такое, як у тых кніжках, што ты чытаеш. Канечне, навука — справа карысная, я не адмаўляю. Але...

Тут Аркадзь паклаў мне на плячо руку і, нахіліўшыся, даверліва зазірнуў у вочы:

— Але скажы мне чэсна, хіба дыплом — гэта галоўнае ў жыцці?

Не разумеючы, да чаго ён хіліць, я няпэўна паціснуў плячыма.

— Вось то-та і яно! — па-свойму вытлумачыўшы маю няпэўнасць, зазначыў Аркадзь. — Галоўнае ў нашым жыцці — грошы. Так, так, не крывіся: гро-шы-ы!.. Яны — і мой дабрабыт, і мой гонар, і мая свабода. А гэта што значыць? А гэта значыць, што я павінен умець рабіць — не зарабляць, а менавіта рабіць! — грошы. Вось паглядзі на мяне...

Аркадзь нават ступіў крок назад, каб я мог лепш яго разглядзець.

— Вось гэтая сарочка, ты думаеш, колькі яна каштуе? Амаль сто долараў! А гэтыя фірмовыя штаны? А туфлі? А замежны гадзіннік з залатым бранзалетам? І што, усё гэта я змог бы купіць на сваю зарплату? Чорта з два! Трэба, дарагі мой суседушка, умець круціцца, умець кумекаць... Жыццё, брат, — штука пасур'ёзней, чым любы твой экзамен. А яны думалі, калі выгналі Аркадзя са школы, дык Аркадзь прападзе. Як бачыш, не прапаў. І не я да дырэктара на паклон пайшоў, а ён да мяне.

Я запытальна паглядзеў на Аркадзя.

— Ты яшчэ не ведаеш? — ухмыльнуўся ён. — О, гэта цікава. Грузавік на двары бачыў? На ім я прыехаў сюды ў камандзіроўку. Ну не зусім сюды, крыху далей — у Ганцавічы, там адна наша часць праводзіць вучэнні. Камандаванне дывізіі адправіла мяне... не буду гаварыць з чым, гэта не важна. Словам, я скарыстаў момант і ўкінуў у кузаў сотню-другую лістоў шыферу. Дэфіцыт! Ведаў, што тут у мяне яго за любую цану возьмуць. Але не думаў, што першым прыбяжыць наш Мікалай Сцяпанавіч. О, ты б толькі бачыў, як ён тут учора да мяне падлашчваўся — лістом сцяліўся. Я яму такую цану загарадзіў — у яго ажно вочы на лоб палезлі. "Пабойся Бога, кажа, не для сябе ж бяру — для школы". Забыўся, відаць, як ён мяне з гэтай самай школы выключаў. Ну ды ладна. Я крыўды на яго не трымаю. Добрыя людзі памаглі мне з атэстатам, усё ў парадку. І шыфер я, канечне, яму прадам, — ён зноў задаволена ўхмыльнуўся. — Але хай трохі пабегае, можа, зразумее, што ў гэтым жыцці галоўнае...

Зайшла ўстурбаваная цётка Зося, папрасіла Аркадзя памагчы загнаць кормніка назад у хлеў, а то, халера на яго, зламаў загарадку і носіцца, як падсмалены, па двары.

Я памкнуўся быў ісці разам з Аркадзем, але ён спынуў мяне:

— Пасядзі. Мы з вадзіцелем управімся самі. Я хутка.

М-да... Аркадзь застаецца Аркадзем, міжволі падумалася мне, калі я застаўся адзін.

Некалі, яшчэ ў дзяцінстве, ён, гады на тры старэйшы і на многа хітрэйшы, падбіў нас, суседскіх падлеткаў, гуляць у магазін. Паставіў перад намі пляшку са звычайнай, калодзежнай вадой, але падфарбаванай вішнямі, і аб'явіў:

— Гэта — морс. І ў Амерыцы такога не знойдзеце. Налятайце, пакуль не разабралі!

Глядзім мы на пляшку і аблізваемся. А ён падахвочвае:

— Ну, хто першы? Нядорага: яйка — шклянка морсу.

У тое лета я не раз чуў, як суседкі скардзіліся адна адной, што куры чамусьці раптам перасталі несціся. І толькі наш "прадавец" хадзіў задаволены: штодня еў смачныя цукеркі, курыў дарагія цыгарэты.

У дзевятым класе за пастаянныя двойкі Аркадзя выключылі са школы, і ён вымушаны быў пайсці ў калгас. Знайшоў падыход да брыгадзіра, пастаўляючы яму самагонку, і той пасылаў хлопца на работу толькі з канём. Прычым туды, дзе можна было пагрэць рукі. Амаль кожны вечар, пасля работы, Аркадзь заязджаў у двор і скідваў то нейкія мяшкі, то дошкі, то сена.

Аднойчы, як зараз помніцца, Аркадзь вёз дадому дровы. Нагрузіў звыш меры. Бедны конік ажно клаўся ў аглоблях, цягнучы па пясчанай дарозе непасільна цяжкі воз. У дзвярах конь спатыкнуўся і ўпаў на пярэднія ногі. Мацюкаючыся, Аркадзь пачаў лупцаваць яго пугай — па спіне, па галаве. Конь адчайна тузануўся, падняўся, але скрануць воз з месца ўжо не было сілы, і ён адно толькі паволі, самотна махаў галавою. А ў яго вялікіх, разумных вачах блішчэлі слёзы...

— Парадак! — паціраючы рукі, зайшоў у хату Аркадзь. — Ну што, яшчэ па чарцы?

Мне раптам падалося, што ў хаце невыцерпна душна, няма чым дыхаць.

— Галава нешта забалела, — падняўся я з-за стала. — Пайду хіба дадому.

І, не падаючы Аркадзю рукі, пайшоў да дзвярэй. На двары выпраміўся, удыхнуў на поўныя грудзі свежага паветра.

...Недзе пад восень, калі я ўжо зноў быў у Мінску, прыйшло пісьмо з дому. Сястра пісала, што наша суседка цётка Зося прала на рэчцы бялізну і моцна застудзілася. Цяпер ляжыць у бальніцы пры смерці. Давалі тэлеграму Аркадзю. Ад яго прыйшоў кароткі адказ: "Прыехаць не магу. Надзвычайныя абставіны". Але ў вёсцы ўсе баялі — пашкадаваў грошай.

•

Штотыднёвік "Літаратура і мастацтва" віншуе Зіновія Кірылавіча з 60-годдзем і зычыць яму далейшых творчых поспехаў і моцнага здароўя!



Арт-пацеркі

Міжнародны тэатральны фестываль "Панарама" нарадзіўся на базе Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы. Яго нядаўняй прэм'ерай "Эрык XIV" паводле А.Стрындберга і адкрыўся 14 кастрычніка новы фэст, які выклікаў вялікую грамадскую цікавасць. Наогул, ён прысвячаўся 60-годдзю вызвалення Беларусі ад гітлераўскіх акупантаў і юбілею Вялікай Перамогі над фашызмам. Таму фестывальная праграма ўключала ўвасобленую Гомельскім абласным драматычным тэатрам п'есу "Радавыя" А.Дударава, "Плошчу Перамогі" А.Паповай у пастаноўцы Акадэмічнага тэатра імя Якуба Коласа, спектакль купалаўцаў "Балада пра каханне" паводле аповесці В.Быкава "Альпійская балада". Апроч найбольш адметных пастановак беларускіх тэатраў, "Панараму" склалі спектаклі гасцей з Літвы, Расіі, Сербіі, Украіны.

На працягу тыдня ў нашай краіне ладзілася перадвыбарная дабрачынная акцыя "За Беларусь!" У ёй удзельнічалі вядомыя эстрадныя салісты і творчыя калектывы: Дзяржаўны канцэртны аркестр Беларусі, Акадэмічны народны хор імя Г.Цітовіча, "Песняры", "Сябры","Бяседа" ды інш. Канцэртны марафон прынялі розныя рэгіёны; вялікая праграма, да якой далучыліся і поп-выканаўцы з Расіі, прайшла ў Мінскім палацы спорту.

Урачыстасці, звязаныя з ушанаваннем работнікаў культуры Беларусі, якія штогод у кастрычніку адзначаюць сваё прафесійнае свята, адбыліся ў абноўленым будынку сталічнай філармоніі. Асаблівы настрой прысутных сілкаваўся яскравымі эстэтычнымі ўражаннямі ад філарманічнай залы і фае: пасля капітальнага рамонту ўсё тут відавочна папрыгажэла. Святочную атмасферу аздобіла і гучанне музыкі. У канцэртнай праграме ўдзельнічалі зоркі айчыннай эстрады. Выступіў і прызнаны далёка за межамі нашай краіны Дзяржаўны камерны аркестр Беларусі. У арт-фае знаны калектыў з маэстра П.Вандзілоўскім граў самую вытанчаную музыку са спадчыны П. Чайкоўскага, Э. Грыга ды фрагменты з неарамантычнай або, калі хочаце, неакласічнай сучаснай беларускай сюіты А.Літвіноўскага "Consort lessons", прэм'ера якой адбылася падчас аднаго з мінулых фестываляў "Музы Нясвіжа".

Сёння, 22-га, у сталічнай Зале камернай музыкі адбудзецца канцэрт-вечар памяці заслужанага дзеяча мастацтваў Беларусі Уладзіміра Шаліхіна. Удзельнікі — музыканты, якім пашчасціла на творчае супрацоўніцтва з легендарным вядучым філарманічных праграм: Л.Ластаўка (альт), М.Марэцкі (мандаліна), Т.Старчанка (фартэпіяна), спевакі, маці ды сын, Т.Громава, У.Громаў. Замоўлены дэбют юнай скрыпачкі Улады Беражной.

С. ВЕТКА

У савецкія часы кожная кінастудыя арганізоўвала для сябе тэатр кінаакцёра. Усе гэтыя тэатры ствараліся як пляцоўкі, здатныя забяспечыць трэнінг артыстаў кіно. На ўсёй постсавецкай прасторы сёння захаваўся толькі адзін такі тэатр — у Мінску. Тэатр-студыя кінаакцёра нацыянальнай кінастудыі "Беларусьфільм" не толькі выжыў, але яшчэ і здолеў вырасці з колішніх рамак і стаць рэпертуарным тэатрам, да таго ж і вельмі папулярным. Акцёры з Санкт-Пецярбурга, Масквы, Кіева прыязджаюць сюды і з задавальненнем выходзяць на яго сцэну. Што цяпер адбываецца ў тэатры кінаакцёра? Чым ён парадуе гледачоў у гэтым сезоне? Гутарым з яго мастацкім кіраўніком Аляксандрам ЯФРЭМАВЫМ.

Не расчараваць людзей...

— Аляксандр Васільевіч, нядаўна тэатр уступіў у 23-ці сезон. Чым быў адметны для вас сезон мінулы, і што чакае гледачоў у новым?

— За мінулы сезон сыграна больш як 220 спектакляў. У нашай маленькай зале пабывала больш як 45 тысяч гледачоў. Сярэдняя запаўняльнасць залы была каля 85 працэнтаў. Мне здаецца, што гэта адзін з самых высокіх паказчыкаў у краіне. Магло быць болей, але ёсць адна праблема: мы — тэатр рэпертуарны, таму неабходная змена спектакляў. А ў нас, на жаль, прэм'ера адбываецца толькі раз на два гады, у лепшым выпадку раз на год. На некаторыя спектаклі нашы гледачы прыходзяць па некалькі разоў. Мы ганарымся гэтым, але вельмі хацелася б радаваць іх новымі пастаноўкамі часцей.

Сёлета ў нас адбылася-такі прэм'ера. Спектакль "Навечна ў памяці", прысвечаны 60-годдзю Перамогі над фашысцкай Германіяй. Паставілі яго Аляксандр Бяспалы і Уладзімір Грыцэўскі. Спектакль зроблены ў эстэтыцы і стылістыцы тэатра "Латэрна Магіка" (Быў такі эксперыментальны тэатр у чэхаў; калі з экрана сыходзілі жывыя артысты і разыгрывалі дзеянне на сцэне). Стваральнікі спектакля выкарысталі ўрыўкі з фільмаў, дзе былі занятыя нашы акцёры, і таксама перанеслі дзеянне на сцэнічную пляцоўку. Спектакль, на мой погляд, атрымаўся вельмі цікавы. Спадзяёмся, што ў гэтым годзе ў нас штосьці атрымаецца з "Майстрам і Маргарытай" паводле Булгакава. Гэты спектакль ставіць выпускнік Беларускай акадэміі мастацтваў Алег Кірэеў. На жаль, пакуль рабіць усё даводзіцца сваімі намаганнямі. Таксама спадзяёмся на дапамогу Міністэрства культуры — пастаноўцы спектакля паводле Марыі Ладо "Зусім простая гісторыя". І ўрэшце мы спадзяёмся, што гледачы, як і ў мінулым сезоне, будуць прыходзіць на нашы спектаклі. Мы іх любім і імкнёмся зрабіць усё, каб ім было камфортна і ўтульна ў нашым тэатры. Дарэчы, у мінулым сезоне мы зрабілі невялікі рамонт: зала пасвятлела, зрабілася больш камфортнай. А на сродкі, якія нам былі выдзелены паводле гранта Прэзідэнта рэспублікі, мы пераасналі светлатэхнічную апаратуру. Увогуле, мы жывём, мы развіваемся, імкнёмся быць карыснымі і цікавымі.

— Ходзяць чуткі, што ў вашым тэатры мала прэм'ер з-за таго, што вы больш часу аддаяце кіназдымкам і менш тэатру. Наколькі гэта слушна?

— Гэта ўвогуле несправядліва. Мы імкнёмся паставіць спектакль пры першай магчымасці. Але, як я ужо гаварыў, на гэта патрэбна шмат грошай. Каб паставіць добры спектакль, у якім ёсць пэўная колькасць акцёраў, касцюмы, дэкарацыі, трэба, па меншай меры, 25—30 мільёнаў. А ў нас няма пастаяннага фінансавання. Даюць грошы, калі з'яўляецца магчымасць. А тое, што я здымаю кіно — на мой погляд, гэта вельмі добра для тых жа акцёраў, якія працуюць у нашым тэатры. Напрыклад, пасля "Павадыра", дзе дэбютавалі Валерыя Арланава, Пётр Юрчанкоў-малодшы, Анатоль Кот, Джэмал Тэтруашвілі, Вера Палякова, — яны зрабіліся вельмі запатрабаванымі як у кіно, так і ў тэатры. Цяпер яны пастаянна здымаюцца ў розных фільмах, а гэта наш прафесійны шлях. Скажам так, што калі пазбавіць іх гэтага, значыць пазбавіць тэатр кінаакцёра яго асноўнай задачы — рыхтаваць акцёраў для нашага беларускага кіно, якое мае патрэбу ва ўздыме і адраджэнні не менш, чым тэатр.

— Глядач вашага тэатра: які ён? Напэўна, ёсць свая пастаянная аўдыторыя?

— Думаю, што ёсць. Многія гледачы, як я ўжо казаў, прыходзяць на нашы спектаклі па некалькі разоў. Аўдыторыя разнастайная: і моладзь, і людзі больш сталага ўзросту. Часам на нашы спектаклі прыходзяць людзі больш падрыхтаваныя, часам менш, але я веру, што ўсе яны ідуць сюды з павагай. Я бываю на спектаклях у іншых тэатрах, не толькі ў Беларусі, і зрэдку бачу, што прыходзіць моладзь з жаданнем эпатажу: бляшанкі, цукеркі, шамаценне, перамовы... Нават у адным тэатры бачыў, як гэтыя бляшанкі кідалі на сцэну. Мне здаецца, што ў нашым тэатры ўсё дастаткова культурна. Такіх выпадкаў не было і, спадзяюся, не будзе ніколі.

— Ці лічыце вы, што тэатр павінен апускацца да ўзроўню гледача? Я маю на ўвазе тое, што некаторыя спектаклі, якія ставіліся і ставяцца ў нашай краіне, ніжэй за мастацкія запатрабаванні элітнай публікі.

— Так, на жаль, ёсць сёння такія спектаклі. Але калі ў драматургіі закладзена мера пачуццёвага і эмацыянальнага аўтарскага ўспрымання таго, што паказваецца, я не думаю, што людзі ў зале не здольныя гэтага ацаніць. Апускацца да якой-небудзь патрэбы, да халтуры — нашаму тэатру, прынамсі, гэта не ўласціва. І не павінна быць уласціва ўвогуле ніякаму тэатру. Барацьба за гледача павінна быць высакароднай.

— Што вы маеце на ўвазе?

— Я маю на ўвазе толькі тое, што ў параўнанні з савецкім перыядам у мастацтве стала значна менш цэнзуры, але гэта не значыць, што ўнутранага цэнзара не павінна быць у чалавека, які займаецца гэтай справай. Самае галоўнае і высокае, што дала нам гісторыя славянскай культуры, — духоўнасць. Вось ад гэтай духоўнасці і нельга адступаць. Яе проста неабходна прытрымлівацца. Мабыць, не хапае культуры ці адукаванасці, мабыць, не хапае шырыні разумення ці ўласнай ўнутранай высакароднасці, але імкнуцца да гэтага трэба.

— Аляксандр Васільевіч, на вашу думку: якія задачы паўстаюць перад вашым тэатрам і перад сённяшнім заўтрам увогуле?

— Вы ведаеце, я лічу, што задачы, якія стаяць перад сучасным тэатрам, тыя ж самыя, што стаялі перад ім і шмат гадоў таму. Задачы гэтыя, як ні дзіўна, не старэюць. Адзін з самых песімістычных людзей пазамінулага стагоддзя і адзін з самых геніяльных літаратараў Расіі Мікалай Васільевіч Гогаль гаварыў пра тое, што асноўная задача мастацтва — замірыць чалавека з рэчаіснасцю. Людзі прыходзяць у гэты свет не дзеля злобы, не дзеля нянавісці, не дзеля страху. Яны прыходзяць для надзеі, для любві, для веры) — прабачце за банальныя словы, але менавіта так і ёсць. Нічога іншага чалавек не чакае. Ён жадае шчасця, і задача мастацтва паказаць яму мажлівыя шляхі, ці ў крайнім выпадку, разам абмеркаваць магчымасць існавання гэтых шляхоў. Іншага няма, іншага не дадзена, і тое, што часта абрыньваецца на нас з экранаў тэлевізараў і са старонак газет, стварае хаос і блытаніну ў нашым жыцці. Калі я гляджу тэлебачанне, мне здаецца, што акрамя прастытутак, наркаманаў, забойцаў і міліцыянераў, якія за імі ганяюцца, у гэтым жыцці больш нікога няма. Але гэта няпраўда, гэта не так, гэта нейкая асобная частка нашай рэчаіснасці. Вядома, такія іншыя людзі ёсць, але ў асноўным яны жывуць больш простым жыццём і ў ім жадаюць адчуць і ўсвядоміць высокі сэнс. І я лічу, што асноўная задача тэатра, кіно і літаратуры — не расчараваць людзей.

— Як вы лічыце, вашаму тэатру ўдаецца справіцца з гэтай задачай?

— Калі б я лічыў, што мы цалкам спраўляемся з гэтай задачай, я б, напэўна, зараз сядзеў задраўшы нос і паглядваў на вас з пачуццём вялікай перавагі: маўляў, я не ведаю... Мы ідзём па гэтым шляху, мне здаецца. І я веру, што менавіта таму ў нашу залу прыходзяць гледачы. Прывяду адзін прыклад: калі я толькі прыйшоў у гэты тэатр, пачалася праца над спектаклем. "Мы ідзём глядзець Чапаева". Кожны раз, калі ішоў гэты спектакль, я выходзіў у залу і глядзеў на публіку. Аднойчы заўважыў жанчыну, якая сядзела і плакала. Я падышоў і запытаў, чаму яна плача. Яна мне адказала: "Вы ведаеце, калі я гляджу ваш спектакль, я разумею, што мы выжывем і што ўсё ўрэшце добра". Замірыць людзей з рэчаіснасцю — гэта наша з вамі прыватная задача — ваша і мая. Не расчаравацца ў жыцці, не пакрыўдзіцца на яго, а паспрабаваць зрабіць хаця б для тых, хто побач, гэтае жыццё прыгожым і шчаслівым, і гэта будзе самы высокі грамадзянскі ўчынак у адносінах да сваёй краіны.

Вольга ПАЛЯКОВА

А. Яфрэмаў на здымках фільма "Дунечка".
Фота А. Дзмітрыева

Гучыць ціхая і паэтычная мелодыя. Яна кранае душу сваёй цеплынёй і пяшчотай. Праз чароўныя гукі паўстае вобраз дарагога мне чалавека, друга і настаўніцы — Веры Аляксееўны Лагвіненкі. Музыка ўзнікла ў сэрцы нечакана, як бы сама па сабе, і пачала гучаць усё больш настойліва. Дзівосная мелодыя сцвярджала веру ў дабрыню і прыгажосць чалавечай душы і дарыла ўспамін пра Веру.



Наша Вера...

Метнер. "Саната-ўспамін". Гэта яна быццам спусцілася з нябёсаў і напоўніла душу думкамі-ўспамінамі пра любімую настаўніцу.

Піяністка Вера Лагвіненка, якая больш як 30 гадоў працавала ў Беларускай акадэміі музыкі, была надзелена не толькі музычным талентам. Багацце і дабрыня яе душы не мелі межаў. Чысціня сэрца і ветлівасць заўсёды саграваллі нас, яе вучняў. Мне пашчасціла сустрэць многіх таленавітых і добрых людзей, але такой шчырасці і шчодрасці душы я не знайшла больш ні ў кога. Рэдкі, унікальны талент, які не пераважаць ніякія іншыя багацці.

Вера Лагвіненка нарадзілася 10 мая 1944 года ў маленькай украінскай вёсцы. Воляю лёсу яна была дачкой любові і вайны адначасова: яе бацькі, Аляксей Іванавіч і Ніна Іванаўна сустрэліся на фронце і вельмі кахалі адно аднаго. Ішла вайна. Каб нарадзіць любае і жаданае дзіця, Ніна Іванаўна прыехала з фронту да свекрыві. Але, як медсястра і чалавек высокага грамадзянскага абавязку, яна ў хуткім часе вярнулася на фронт, а маленькая Верачка засталася з бабуляй. Харыціна Рыгораўна была жанчына добрая і мяккая, і ўнучка расла на дзіва падобная да сваёй бабулі.

Пасля вайны сям'я вайскоўца Аляксея Лагвіненкі жыла спачатку ў Польшчы, потым у Брэсце. Нарадзіліся яшчэ дзве дачкі — Валя і Таня. У Брэсце выхавальніца дзіцячага сада звярнула ўвагу на Верыны музычныя здольнасці і прапанавала бацькам вучыць дзяўчынку ігры на фартэпіяна. Маці пачала вучыцца музыцы разам з дачкой. У музычную школу Вера пайшла, калі ўжо сям'я пераехала ў Мінск. Першай настаўніцай фартэпіяна была Д. Дворжац, якая прывяла сваю здольную вучаніцу ў Сярэднюю спецыяльную музычную школу (цяпер — гімназія-каледж пры Беларускай акадэміі музыкі). Там Вера вучылася ў Н.Фаміной. А ў Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі яе настаўнікамі былі І.Палівода і І.Губайдуліна. Аспірантуру В. Лагвіненка скончыла ў знакамітай І.Цвятаевай.

Пачалася плённая праца на карысць музычнага і педагагічнага мастацтва...

Сёлета ёй споўнілася б 60 гадоў. Толькі 60, а яе ўжо два гады няма на нашай зямлі. Цяжка ўсведамляць яе адсутнасць і нельга замяніць. "Святое месца" засталося пустым...

Але засталіся памяць і музыка. Саната Метнера ўзнікае ў згадках зноў і зноў. Яе глыбіня і прыгажосць запаўняюць душу і абуджаюць былыя ўражанні.

Студэнткай кансерваторыі я іграла гэтую санату ў класе Веры Аляксееўны. Музыка захапляла нас абедзвюх паэтычнасцю і асаблівасцю мовы. Мы шмат працавалі над гучаннем і сэнсам санаты. Мая настаўніца пазнаёміла мяне з рамансамі Мікалая Метнера. Мы чыталі яго запісы і парады піяністам, потым дзяліліся меркаваннямі. Неаднойчы ўспаміналі словы яго сябра і сучасніка Сяргея Рахманінава пра тое, што Мікалай Карлавіч Метнер — кампазітар XXI стагоддзя. "Саната-ўспамін"... Светлы смутак першай тэмы, глыбіня і багацце экспазіцыі, палкасць і высакародная мужнасць распрацоўкі гучаць як аповед пра глыбока асэнсаванае і складанае жыццё цудоўнага чалавека. І гэта нездарма, бо душа Веры Лагвіненкі — сама музыка.

Вера Аляксееўна за сваё нядоўгае жыццё зрабіла многа. Была добрай дачкой сваім абавяльным бацькам, руплівай сястрой Валянціне і Таццяне, аднадумцай свайму мужу Аляксандру Мільто, чулай і ласкавай маці свам дзецям, Дзмітрыю і Наталлі, бабуляй унуку Нікіту. Была самаадданай у педагагічнай працы. Рэдкасны прыклад настаўніка, калі справа, якой служыш, вышэй за асабістую карысць.

Вядомы піяніст С. Фейнберг калісьці казаў, што настаўнік павінен быць, па-першае, чалавекам, па-другое — мастаком, потым — музыкантам, а ўжо апошнім чынам — піяністам. Такая і была наша Вера Аляксееўна. У гэтым была яе вялікая сіла, у гэтым было вялікае наша, яе вучняў, шчасце.

Яна падрыхтавала больш як 30 піяністаў-прафесіяналаў. Яе вучні працуюць у Беларускай акадэміі музыкі і гімназіі-каледжы (В.Бельцюкова, В.Крыцкая, А.Зыль, В.Сізко-Габрыелян). На Беларусі і за яе межамі дае сольныя канцэрты В. Маняці, працуе ў Злучаных Штатах Амерыкі Р.Менькіна, у Маскве — Т. Шумілава, Л. Болдырава, у Ніжнім Ноўгарадзе — Т. Калашнікава. У музычных вучылішчах Беларусі выкладаюць Т. Сідарава, В. Бабароўская, М. Вайтовіч і іншыя. Апошняя вучаніца, якая адмаўлялася ад іншых настаўнікаў і хадзіла займацца да ўжо цяжка хворай Веры Аляксееўны дадому, Таў Кі — цяпер працуе ў Кітаі.

Усіх не пералічыць, але мы ўсе памятаем сваю настаўніцу, ведаем, як глыбока і мякка павінен гучаць раяль, як добра трэба ставіцца да сваіх вучняў і калег. Ведаем, што мацней за ўсё — Прыгажосць і Вера ў чысціню і дабрыню.

Вера Лагвіненка была цудоўнай выканаўцай. Яна многа выступала як салістка і як піяністка ў ансамблі. У маладосці працавала канцэртмайстрам хору са знакамітым В. Роўдам, была піяністкай-партнёрам у ансамблі з вакалістам Д. Марозавым, флейтыстам С. Сізко, са сваёй сястрой — скрыпачкай Валянцінай Савінай. Са студэнцкіх гадоў памятаю канцэрт камернай музыкі, на якім сёстры Вера і Валянціна выканалі тры скрыпічныя санаты Я. Брамса. Поўныя глыбіні і майстэрства былі канцэртныя праграмы, падрыхтаваныя разам з аднакласнікам, вядомым скрыпачом І. Шульдманам. Беларусь, Расія, Украіна, Нарвегія, Германія, Францыя чулі майстэрскую ігру піяністкі Веры Лагвіненкі. Яна шчодра дзялілася сваім талентам. З мужам, піяністам А. Мільто, на сваёй дачы ў Ждановічах ладзілі летнія музычныя фестывалі, на якія збіраліся цікавыя госці, выканаўцы-прафесіяналы, а ўдзячнымі слухачамі былі суседзі. І ў маленькіх Ждановічах, і ў Заходняй Еўропе гучалі яе паэтычныя Шапэн, Моцарт, Шуберт, Грыг.

Як памяць, застаўся дыск, зроблены з апошніх канцэртаў. Вонкі — адна з апошніх фатаграфій Веры Аляксееўны, дзе ў яе поглядзе адгадваецца думка чалавека, які ўсвядоміў завяршэнне свайго зямнога шляху. А запіс — гучанне раяля, у якім засталася яе чулая, пяшчотная душа...

Я ўдзячная Богу, удзячная лёсу, удзячная свайму бацьку (вучыцца па спецыяльным фартэпіяна ў В. Лагвіненкі — яго парада) за такую настаўніцу.

Вялікі дзякуй і светлая памяць, дарагая Вера Аляксееўна!

Вольга СІЗКО-ГАБРЫЕЛЯН

Галоўны "Лявон" Воранаўшчыны

Імя гэтага чалавека — добразычлівага, шчодрага на ўсмешку і гумар, прыгожага душой і тварам — выклікае ва ўсіх, хто яго ведае, самыя прыемныя асацыяцыі. А ведаюць Вячаслава Мацкевіча, вялікага аматара і майстра народнай музыкі, дзесяткі тысяч жыхароў яго роднага Воранаўскага раёна, іншых раёнаў Гродзеншчыны, дый шмат дзе на Беларусі, а таксама ў блізкім і далёкім замежжы. Ведаюць паўсюль, дзе выступаў створаны ім у 1981 годзе ансамбль фальклорнай музыкі "Лявоны": гастрольныя ды фестывальныя маршруты вялі ў Азербайджан і Польшчу, Эстонію і ЗША, Расію, Літву, Германію...

Літаральна за некалькі хвілін хады ад беларуска-літоўскай мяжы — яго "малая радзіма". Ён яшчэ ў дашкольныя гады здзіўляў родных і суседзяў уменнем граць на грабяні з закладзенай туды палоскай тануткай паперы. Сусед-гарманіст Вацлаў Юрка, уражаны музычнымі імправізацыямі Чэсіка, рашыўся на ліхі ўчынак: пазбавіў жыцця блуднага сабаку і з яго апрацаванай скуры вырабіў нядрэнны бубен, які аддаў малому. Хлопчык без аніякіх рэпетыцый паказаў штукарствы на ўжо другім у сваім жыцці музычным інструменце, прычым разам з тым самым гарманістам Вацлавам, на вясковых танцах.

Праз некалькі гадоў старэйшы брат прывёз Чэсіку з далёкай камандзіроўкі сапраўды царскі падарунак — навюткі гармонік. Вось ужо было радасці ў хаце!

Далейшы шлях даравітага юнака быў вызначаны: звязаць жыццё з музыкай. Гродзенская музычна-педагагічная і Маладзечанская музычная вучэльні, Ленінградскі інстытут культуры — тут развіваў і шліфаваў ён свой талент. А працаваць пачаў у сваім жа раёне — настаўнікам музыкі і спеваў Забалацкай СШ.

У 1968-м у жыцці В.Мацкевіча адбыліся важныя падзеі. Першая: ён страціў статус халасцяка і зайздроснага жаніха. Аднойчы на мясцовых танцах заўважыў прывабную дзяўчыну... у шлёпанцах. Вывеўшы яе на факстрот, паспрабаваў даказаць, што шлёпанцы для танцаў — недарэчны, ненадзейны абутак. Ды не на тую натрапіў! Зграбная танцорка, маладая медычка Марыя паланіла сэрца Вячаслава адразу і незваротна.

Другая тагачасная падзея: маладую сям'ю запрасілі на сталую працу ў райцэнтр — Воранава. І праз дзевяць гадоў В.Мацкевіч узначаліў мясцовую музычную школу. Пасаду дырэктара ён спалучыў (і спалучае) са справамі ў ансамблі народнай музыкі Воранаўскага РДК "Лявоны".

Універсальны музыка Вячаслаў Канстанцінавіч! Пра яго кажуць "чалавек-свята", "чалавек-аркестр". Гармонік, баян, скрыпка, жалейка, акарына, ражок, бубны, тамбурын, дудкі і нават побытавыя рэчы, кшталту маслабойкі, у яго "працуюць" па найвышэйшым класе, выдаюць цудоўную музыку, якая не можа не паланіць слухача. І поруч з мастацкім кіраўніком ансамбля заслужаным работнікам культуры Беларусі В.Мацкевічам — яшчэ дзевяць "Лявонаў", апантаных аматараў інструментальнага грання і спеваў. Людзі розных прафесій, яны паяднаныя імкненнем адраджаць, захоўваць і прапагандаваць беларускую народную музычную творчасць.

Уладзімір РУЛЬ
в.Нача, Воранаўскі раён

Падарожжа ў дажджлівую ракаўскую раніцу

Усім вядомы той факт, што ў XV стагоддзі ў Ракаве было яўленне Святой Дзевы Марыі.





Так сталася, што той дзень, на які я атрымала запрашэнне наведаць хатні музей-галерэю Янушкевічаў, выдаўся вельмі дажджлівым. Раненька, нават не паснедаўшы, як след, я паспяшалася выправіцца з дому ў дождж, каб не пачуць ад родных абвінавачванне ў дзіўных паводзінах.

Ужо за горадам, у аўтобусе, ўсё абдумвала — можа, хоць Ракаў сустрэне гасцінными промнямі сонейка. Ды не. Паўсюль мокра, лужыны; моцны бясконцы лівень. І ў каго запытацца ў такую непагадзь, дзе жыве той дзіўны чалавек, які на свае ўласныя сродкі і ў сваім доме стварыў унікальны па значнасці і мастацкіх каштоўнасцях музей-галерэю старых рэчаў?

— В-у-нь той прыгожы і велізарны з чырвонага каменю дом. — Некуды ўбок паказала прахожая бабулька. А потым, як толькі я адышлася, сама сабе ў нос. — Вот! Не сядзіцца!

Першае ўражанне, кажуць, самае непадманлівае. Аднак, на павер выйшла, што не так усё па-дзівацку і чараўніча, як яно спачатку падалося.

Доўга паблукаўшы вакол дома, а дакладней, вакол яго «замкавай» велічнай агароджы, я, нарэшце, наважылася — штурхнула злёгку вароты, і яны гасцінна адчыніліся. Крок наперад. Невядома адкуль, быццам з неба, сабачы брэх. Я аслупянела. Перада мной, бы знерухомеў, сядзеў велізарны звер. Прыгледзелася лепш — аж ён і сапраўды нерухомы, бо бронзавы, выраблены ў натуральную велічыню сабака. Пасля Фелікс на развітанне патлумачыць, што гэта дакладная копія таго сабакі, што ў Нясвіжскім парку.

Насцярога мая яшчэ больш узрасла. Паміж розных будынкаў і міні-будыначкаў, што падаліся мне на адзін «твар», я ўбачыла вялізную колькасць малавядомых і зусім невядомых старых рэчаў. Аднак больш за ўсё ўразілі ў гэтым «згубленым свеце» керамічныя вырабы, якія стаялі ў некалькі радоў паўздоўж каменнай сцяны-агароджы. Дарэчы, калекцыя рэдкіх керамічных вырабаў, якая налічвае 1700 відаў, з'яўляецца асаблівым прадметам гонару для Фелікса Янушкевіча — кандыдата мастацтвазнаўства, рэстаўратара (пры яго непасрэдным удзеле і дапамозе былі адноўлены фрэскі на славутым касцёле св. Станіслава, што ў Магілёве), перакладчыка (спадар Фелікс пераклаў на выдатную беларускую мову вядомы раман С. Пясецкага «Каханак Вялікай Мядзведзіцы»).

— Калі паўстала пытанне, дзе будавацца і дзе ў далейшым ствараць музей, то я адразу вырашыў — толькі ў Ракаве! — з цікавасцю расказвае ў шыкоўнай імпрэзаванай гасцёўні спадар Фелікс Янушкевіч. Ракаў вядомы з XV стагоддзя ў Вялікім Княстве Літоўскім. У розныя часы належаў Кенжгайлам, Завішам, Сангушкам, Салагубам. Ракаў — не тое месца, дзе водзіцца шмат ракаў. «Ра» гэта, магчыма, міфалагема, якая азначае ў перакладзе са стараегіпецкага «Бог сонца», а другая частка — міфалагема «Ка» — вечны рух, вечнае жыццё.

Усім вядомы той факт, што ў XV стагоддзі ў Ракаве было яўленне Святой Дзевы Марыі. Расказваюць, што нейкі сляпы ад нараджэння дзед аднойчы стаў відушчым. Справа ў тым, што ў сне ён пачуў голас Прасвятой Багародзіцы. Яна загадала яму ісці на захад, спыніцца каля вялікага дрэва і перакапаць крыху зямлі. Калі ж стары зрабіў так — выканаў тое, што загадала Маці Божая — то на ўскраіне Ракава забілася крынічка. Старэча абмыў свой твар. І першае, што ён убачыў, быў абраз Багародзіцы, ад аблічча якой выпраменьвалася святло.

— Вот яно як! — энергічна ўсміхаючыся, зазначыў Фелікс. — Сама Маці Божая з'яўлялася патронкай нашага слаўнага мястэчка Ракаў!

З годнасцю аглядаючыся навокал, думае пра нешта сваё, успамінае... потым нечакана з весялосцю гаворыць:

— З тых часоў засталася невялікая драўляная каплічка. У вайну, калі немцы адступалі, і праз Ракаў таксама, то адзін з іх, мабыць, самы празорлівы, закапаў непадалёк ад храма свой нарабаваны скарб.

Праз шмат гадоў яго ўнук прыехаў у Ракаў, каб адшукаць тое багацце. Шукаў-шукаў, ды ўсё ніяк не мог знайсці. Нехта з мясцовых мужыкоў запытаўся ў яго ў чым справа? А ён у роспачы расказаў, што нібыта яго дзед насупраць ад крыжа, што стаіць на капліцы, закапаў ноччу нарабаваны скарб. Фрыц не ведаў, што за нядоўгі пасляваенны час на страсе той каплічкі рабілі рамонт, таму крыж крыху пасунулі. Вось такім незвычайным чынам ракаўская казна значна пабагацела, дзякуючы таму золату, якое мужыкі адкапалі на «тым» месцы.

— Хто яго ведае, можа, і сапраўды Маці Боская пасадзейнічала? Хаця, зноў жа, не зразумела, чаму безабароннымі засталіся шэсць ракаўскіх цэркавак, якія знішчылі па загадзе партыі? Тады ж, прыкладна, знік і цудадзейны абраз. А недзе ў 80-х гадах мясцовыя вандалы спалілі славутую драўляную капліцу. (Канечне, пасля вернікі пабудавалі на гэтым святым месцы, дзе і зараз б'е цудадзейная крыніца новы, каменны храм з сімвалічным надпісам: «З Бога не насмяешся»...).

— Шкада, — працягвае суразмоўца, — што людзі не разумеюць — яны абрабоўваюць не храмы, не культурныя помнікі, а самі сябе! Духоўна абнішчалы народ горш за ўсякае ліха. Мы абкрадаем самі сябе! А чаму?

Тут жа ў Ракаве, у яго святой зямлі столькі культурных каштоўнасцяў! Мабыць, нідзе ў Еўропе няма такога месца, дзе на невялікім лапіку зямлі магчыма было б адкапаць гэтулькі знаходак!

Толькі ў сябе на ўчастку я знайшоў 94 узоры кафлі! А што казаць пра старажытныя курганы на ўскраіне Ракава! У іх кожныя 20 сантыметраў — гэта асобны пласт старажытных пахаванняў. (Маюцца на ўвазе тыя рэлігійныя спальванні, якія праводзіліся ў старажытнасці на гэтай мясцовасці. — **Аўт.**)

— А наша славутая ракаўская кераміка! Па тым часе адзін ракаўскі збанок раўняўся па кошце двум звычайным гаршчкам! Посуд мянялі на скаціну, такая якасная была прадукцыя! Выраблялі, пераважна, гаспадарчы посуд, аздоблены выціснутым арнаментам, ці анґобнай размалёўкай у выглядзе прамых і хвалістых канавак, завіткоў, рысак, раслінных парасткаў, а таксама кафлю. Посуд пластычных акруглых формаў звычайна пакрывалі звонку і ўнутры празрыстай палівай. Выраблялі таксама дэкаратыўныя талеркі з надпісамі па жаданні; попельніцы, фігурныя пасудзіны і шмат іншага. Выраблялі, безумоўна і цацкі! (Спадар Фелікс гасцінна працягвае мне дзіцячую гліняную свісцёлку — **Аўт.**)

Тым часам дождж сціх зусім. У дзвярах музея паказаўся маленькі хлопчык. Неяк раптоўна знік і Фелікс. А мяне ногі самі павялі да тых старых рэчаў, якія месціліся нават на падлозе. Сярод іх партрэты розных людзей (гістарычных, і не толькі, славутасцяў); усялякія скульптуры і статуэткі, крыху збоку, знойдзены ў ... свінарніку, старадаўні музычны інструмент. (Нядрэнна сабе харчаваліся свінні!); нават фрагменты ўсім вядомых слуцкіх паясоў. А яшчэ шмат-шмат іншых цікавых рэчаў, якія варта ўбачыць самому, нават калі для гэтага прыйдзецца здзейсніць падарожжа ў дажджлівую ракаўскую раніцу.

Нечакана над вухам:

— А вось гэты збан незвычайны — з сакрэтам! Напіцца — не абліцца! — бадзёра прамовіў спадар Фелікс. — Ну, Света, адгадай сакрэт!

Сакрэт, пасля шматлікіх версій, мы нарэшце «раскрылі». Гэты незвычайны збан некалі ў даўніну саслужыў некаторым ілжывым людзям, ці проста тым, хто не спадабаўся князю, дурную службу. (На фотаздымку добра не бачна, што на гарлавіне пасудзіны маюцца дзіркі ў форме трохкутнікаў). Дык вось, тыя, хто не здолеў напіцца, гублялі свае галовы.

Адным з нямногіх, хто раскрыў сакрэт дзіўнай пасудзіны, быў славуты пісьменнік Уладзімір Караткевіч. Завітаўшы аднойчы ў музей, Караткевіч сказаў Феліксу: «Налівай, нап'юся!» Былі часы!

Нарэшце, непасрэдна ў майстэрні выдалася магчымасць запытацца менавіта пра творчасць.

— Нярэдка ў нашыя дні творца, яго талент і творчасць «загнаныя» ў пэўныя рамкі. Калі ты яшчэ студэнт мастацкай вучэльні, ці то акадэміі мастацтваў, то ты змушаны думаць пра заробак. Стыпендыя мізэрная! А калі ты выдатны, сталы мастак з сусветным імем, то ўсё роўна вымушаны задумвацца пра тое, каб «адваяваць» майстэрню на вышэйшым «паверсе», выстаўляцца ў лепшых залах — інакш ты будзеш непрызнаны!

Памаўчаўшы, сумна дадае:

— Смешны наш час. Смешны і сумны. Міжволі адбываецца «тленнасць вечнага прадукта». Мастак памірае, нават самы славуты мастак. Яго працы прадаюць сваякі, майстэрню аддаюць іншаму. А што застаецца?..

Я задумалася таксама. Адразу зрабілася сумна.

Але ж пойдзем далей!

Я азірнулася і ўбачыла, што мы стаім каля таго ж стала, з якога пачыналася наша размова. Нечакана мне прыйшло ў галаву запытацца:

— Як з'явілася ідэя стварыць такі унікальны музей?

— У 1992 годзе я пабываў у тэатры Сальвадора Далі. Там на сценах віселі ў поўную велічыню адны з самых лепшых твораў мастака. Я памятаю, мяне гэта так уразіла! Гэта было настолькі геніяльна! Тады я вырашыў зрабіць у Ракаве нешта падобнае.

Ужо ідучы на аўтастанцыю, я ўсё таропка абдумвала такое захапляльнае наведванне. Мне ўсё здавалася, што і сапраўды ёсць у гэтым нешта лёсавызначальнае, загадкавае, імгненнае і вечнае адначасова. Варта толькі прыслухацца да сябе, сваіх пачуццяў, уражанняў, памкненняў... І ты зразумееш, што гісторыю твораць менавіта такія людзі!

Святлана КАНАНОВІЧ

На здымках: Фелікс Янушкевіч; інтэр'ер музея-галерэі.

Шчырасць найбольш паслядоўных апанентаў постмадэрну можа сапернічаць, бадай, толькі з зацятай ахвярнасцю ягоных апалагетаў.
Найчасцей апаненты постнеакласічнай славеснасці (па аналогіі з "эвалюцыяй" філасофіі ад "класікі" праз "неакласічнасць" да "постнеакласічнасці") аргументуюць сваю "ідэйна-эстэтычную непрыязь" тым, што стваральнікам постлітаратуры ўдаецца зымітаваць толькі форму, знешнія праявы сучаснага светаадчування, у мітусні і бязладнай мешаніне якіх губляецца сутнасць духу эпохі, а значыць, разбураецца раўнавага планаў выражэння і змястоўнасці — замест мастацкага вобраза, дынамічнай цэласнасці, маем ZERO.
З бездані контраргументаў саміх адэптаў постмадэрна паўстае манументальная ў сваёй пераканаўчасці выснова: якое жыццё — такая і літаратура (vs філасофія, культура і г.д.).
Знаходзяцца, аднак, адчайна адважныя сучаснікі, што, адрынуўшы страх-ляноту ды не зважаючы на відавочную колькасную перавагу "апанентаў", няспешна майструюць "труну" наўзбоч манумента, які і сёння дабудоўваецца. І гэта ёсць трыумфам таго слыннага плюралізму, за які сам постмадэрн дагэтуль пралівае кроў на гладыятарскай арэне найноўшай культуры.

Ірына ШАЎЛЯКОВА

Філасофія як гульня



Размова, натуральна, пойдзе пра філасофію постмадэрна. Згаданая філасофія выявіла гнуткасць і пластычнасць філасофскага матэрыялу, гэтых канцэптуальных блокаў, што складваліся на працягу стагоддзяў, засведчыла іх імкненне складвацца ў вар'яцкія камбінацыі. Арыгінальнасць камбінацый сталася арыгінальнасцю філасофіі. Практычна ўсё ў рэальнасці можна спалучыць з усім, было б жаданне. Сёння адно можна ўбачыць дрэвам, за якім праглядваецца лес усяго астатняга, заўтра — яны мяняюцца месцамі і функцыямі. Дзе дрэва, дзе лес? Блуканне ў трох соснах усведамляецца заняткам прэстыжным: не кожны здольны. Філасофія пачала нагадваць гульню ў канструктар лега (lego) ці гульню ў бісер, каму што падабаецца. Калібр філосафа сёння наўпрост вызначаецца магчымасцямі камбінатара.

І варта аддаць належнае: каб аперыраваць сэнсамі, культурнымі знакамі, іх неабходна здабыць, засвоіць, праінтэрпрэтаваць. Элітарная гульня мае на ўвазе выключную эрудыцыю і, так бы мовіць, волю да гульні. Лега-філосаф, падобна сапраўднаму філосафу, павінен цікавіцца ўсім. Тады ён артыстычна выштукуе карункавыя вежы з часова спалучаных сэнсаў, створыць эфемерныя канструкцыі жалезнай логікі, што са смехам рассыпаюцца, агаляючы віртуальную прыроду культуры. Культура — гэта муляжы і міражы.

Па вялікім рахунку, усё гэта ёсць выражэннем бессэнсоўнасці культуры. Сэнсаў панаставралі процьму, а утылізацыя іх — гульня, і толькі. Ні на што яны не вартыя, аніякай з іх карысці. І ўсё ж у гульні з сэнсамі прысутнічае іншы, супрацьлеглы тэзіс: у свеце існуе і не гульня, штосьці сур'ёзнае і адказнае. Жыццё называецца. У жыццё не пагуляеш, бо стаўкі тут — само жыццё. А ў перасоўванні філасофскіх фішак экзістэнцыйных ставак няма ў прынцыпе, яна, філасофія, ёсць сублімацыя жыцця, не жыццё, але бляклы цень яго, сурагат і падман. Выйграць у такім філасофскім шоу — гэта зняславіць саперніка, вывернуць ягоныя "перакананні", ягоную сістэму знакаў, ператварыць у нішто. У гэтай гульні прайграць азначае быць сур'ёзным.

Натуральна, філасофская гульня мае на ўвазе валоданне "мастакоўствам" — і як спосабам выразнасці, і як стылем мыслення. Асацыятыўнасць і метафарычнасць, што апелююць не столькі да розуму, колькі да пачуццяў, робяцца і матэрыялам, і "субстанцыяй" такой філасофіі. Уласна, філасофія ператвараецца ў літаратуру, але адмысловую літаратуру, дзе ўнутраны сюжэт складаецца з бадзяння па пячорах (а то яшчэ й па "лясных сцяжынах"), патаемных лабірынтах, што звязваюць, напрыклад, Сакрата і Ніцшэ, ці Л. Талстога з Зошчанкам, альбо дыянісійства з фемінізмам. Што захочацца з чым заўгодна.

Якую ж сацыяльную і псіхалагічную функцыі выконвае згаданая філасофія, які сацыяльна-псіхалагічны заказ (паводле выразу марксізму, што яшчэ зусім нядаўна запрог філасофію ў ярмо навукі, які надзвычай сур'ёзна ставіўся да філасофіі — і таму, трэба думаць, заўчасна сканаў) стымулюе гульню са знакамі?

Філасофія-гульня ахоўвае грамадства ад разбуральнага ўздзеяння думкі. Гэтая місія ператварае жартаўнікоў і забаўнікаў у высакародных Блазнаў, у шэкспіраўскіх персанажаў. Гульнёва сцвярджаецца прыярытэт жыцця, натуры выдаецца карт-бланш на тое, каб дрымучае жыццё-якое-не ведае-што-робіць развівалася па сваіх, аўтаномных у адносінах да культуры законах, практычна (як мяркуюць блазны) не адлюстраваных, не прадстаўленых у філасофіі. Таму смешна і несур'ёзна гаварыць пра зваротную сувязь — пра ўздзеянне філасофіі на жыццё. У філасофіі, нібыта, няма такога права, а існуе міф пра такое права. Уласна, міф і становіцца культурай.

Гуллівая філасофія de facto ставіць жыццё вышэй за філасофію і культуру, а філасофію de facto ператварае ў літаратуру, вызваляючы яе ад навязаных ёй колісь навуковых функцый. Атрымліваецца мастацкая, гульнёвая, жаночая філасофія, якая аніякай пагрозы жыццю, нібыта, ужо не ўтрымлівае. Вось камуністы паставілі колы паперадзе каня, філасофію над жыццём — і абняславіліся, насмяшылі народ і філасофскую грамадскасць. Для жыцця ўсяго трэба — не перашкаджаць жыццю, выдаліць філасофію. Ну, не зусім выдаліць, не ў літаральным сэнсе, а ў метафарычным: нейтралізаваць, растварыць у гульнёвым моманце. Аднак філасофія анікуды не знікла, яе нават стала незраўнана больш, але яна на радасць усім перастала быць філасофіяй. Яна перастала лезці паўсюль (філасофіі, як вядома, да ўсяго справа) са славутым культурным рэгламентам.

Бунт супраць рэпрэсіўнай культуры — вось звышзадача маргінальных філасофскіх гульбішчаў, што ні да чаго не абавязваюць. Альтэрнатыва культуры ладу — культура хаосу, бязладдзя, пачатак "хтанічны", дыянісійскі, жаночы, прыродны, мастацкі, іраціянальны. Формамі "хаатычнай культуры" хочацца бачыць (на ўзроўні сацыяльным): дэмакратыю як палітычны эквівалент "бязладдзя", ідэалогію плюралізму, што яе абслугоўвае, постмадэрн як дамінуючую тэндэнцыю ў мастацкай культуры, філасофію як гульню, цывілізацыю (спрошчаную, немудрагелістую культуру) у процівагу "высокай", складанай культуры. Пералік можна працягнуць: індывідуальнасць як суб'ект культуры і сацыяльных адносінаў (у процівагу нацыі; ці: персонацэнтрызм і правы чалавека ў процівагу правам "пераважнай большасці", этнаса і народа); касмапалітычная ўсёяднасць "монакультуры"; разбурэнне высокай культуры — маскультурай, субкультурай ("Бітлз" замест Моцарта, Малевіч замест Тыцыяна, брэйк данс, што выцесніў балет і г.д.); Інтэрнет як мадэль інфармацыйнага хаосу (а магчыма, плюралізму: каму што падабаецца); ідэалогія як "сінтэз" навуковага пазнання і мастацка-псіхалагічнага прыстасавання (мадэрнізацыя закранула і змест ідэалогій: на змену ідэалогіі "ідэалізму" прыходзіць ідэалогія прагматызму: плюралізм плюралізмам — а мода модай)... Усяго не пералічыць. Хіба ж можна пералічыць хаос?

На ўзроўні асобасным, персанальным установка на "бязладдзе" выяўляецца перш за ўсё ў адмове ад культурнай ідэнтыфікацыі: у адсутнасці выразнай ідэйнай арыентацыі, разбурэнні маралі як культурна-дагматычнай установкі, зацыкленасці на "асноўных" інстынктах (ідэалагічны эквівалент: хлеба і відовішчаў), прыярытэце вітальнага над ментальным, жыцця над думкай, кайфу над працаю. Карацей, светапоглядная, этнічная, псіхалагічная, сексуальная маргінальнасць і амбівалентнасць становяцца нормай і ўзорам. Чалавек "ніхто", і завуць яго "ніяк", так сабе, невядомая жывацінка.

Што ж, гуляць дык гуляць. У акрэсленым гульнёвым полі адно дзеянне цягне за сабою другое — дэмакратыя, у прыватнасці, спараджае такую філасофію, якая магла б абслугоўваць максімальнае нежаданне думаць, культурна напружвацца, іманентна ўласцівае чалавеку з натоўпу ці, калі каму больш да душы, чалавеку з народа. Існуе такая тэндэнцыя ў рэальнасці, і гульнёвая філасофія — адлюстроўвае рэальнасць, а не выражае прагрэс культуры. Гэту філасофію можна лічыць новай праекцыяй усё тых жа (старых) патрэбаў чалавека, трыумфам (мастацкай) культуры над пазнаннем. Новым культурным тыпажом становіцца Фама Аквінскі ў бейсболцы, што выступае супраць абортаў.

Час такі. А які час — такая і філасофія. Адзін нюанс: філасофія, што абслугоўвае патрэбы часу, называецца ідэалогіяй і ў такой якасці павінна ўсведамляцца, спасцігацца і асэнсоўвацца больш высокімі формамі тэарэтычнай культуры, а менавіта: навуковай (паводле сваёй культурнай арыентацыі) філасофіяй, што вытлумачае час, але не спяшаецца выконваць ягоныя заказы. Сапраўдная філасофія служыць вечнасці.

Але справа нават не ў іерархіі, не ў тым, што культура як рэгламент і лад нікуды не знікла і знікнуць не магла. Нават у наіўнай перакананасці "гульцоў", што яны вызвалілі чалавецтва ад ідэалагічных кайданоў, ад догмаў і імператываў, тады як насамрэч — набалбаталі і абмыталі свядомасць сусветным павуціннем новай, агрэсіўнай, наскрозь правакацыйнай — словам, гульнёвай — ідэалогіі. Культурафобы ўсяго толькі наступілі на старыя граблі з новым тронкам. А гвалту, быццам свет ляснуў. З нічога. Камедыя-с. Гульцы ў імя жыцця вырашылі ахвяраваць культурай, насмеліўшыся сказаць галоўнае: культура ёсць несвабодаю. Далоў міф, давай свабоду і жыццё. А да таго ж роўнасць, братэрства, шчасце (але не працу і май, барані бог). Вось гэты святы момант — у імя сапраўднага жыцця, светлай будучыні — і хацелася б прасвятліць.

Я, як прадстаўнік культуры (дзе найперш — справа, а забаўка-гульня — пасля: усяму свой час і месца), мяркую, што страхі перад культурай зручныя для таго, хто хоча гэтай самай культурай сілкавацца, але не жадае ў ёй нічога разумець. Камфортна і амбівалентна размясціцца адразу на двух крэслах. Яны лічаць, што гнюсна спажываць культуру і, адпаведна, кармліцца, па законах жыцця. Яны выступаюць у якасці нейкай службы жыцця ("санітары лесу"), авангарднаю псіхалагічнаю абаронаю, як варыянт неарэлігіі, свецкай рэлігіі, так бы мовіць. То бок пытання пра тое, ці насамрэч культура перарасла ў жыццё, што ўяўляюць сабою культура і жыццё, наколькі яны маюць патрэбу адно ў адным і як суадносяцца — гэтыя сапраўды філасофскія пытанні папросту не закранаюцца, гулліва абыгрываюцца. Як выразіўся інфернальны тып Свідрыгайлава — так сабе тэорыя, тэорыя, як любая іншая.

А культура — гэта не так сабе тэорыя, не сховішча ці музей тэорый, не пляцоўка для гульняў. Высокая культура — таксама саюзнік жыцця, толькі яна свядома (а не бессвядома) ахоўвае жыццё. Бессвядомы спосаб абароны жыцця ёсць, уласна, формаю жыцця больш, чым формы культуры. Філасофія як гульня — гэта варыянт капітуляцыі культуры, бессэнсоўнае чаканне дабротаў ад прыроды, стаўка на стыхію, недавер да розуму. Дзіцячая і адвечная хвароба культуры.

Выштукоўваць сэнсы толькі дзеля таго, каб гуляць імі — бессэнсоўна, хаця карысна і прыемна. Прыемна — бо адчуваеш сябе культурным, карысна — бо змагаешся супраць культуры. Словам — гульня-с. А ў апантаных гульнёй ёлупняў ужо ядзерныя дубіны ў руках. Акрамя таго, любая гульня ўсур'ёз заводзіць залішне далёка...

Паглядзіце: у рэальнасці дэмакратыя даўно ўжо выкарыстоўвае метады дыктатуры (а па вялікім рахунку, першая заўсёды была роднасная другой, што азначае: гульцы-культураборцы, калі ім здаецца, што яны апяваюць вольную волю, абслугоўваюць дыктатуру трыбуха), рэалізм жорстка падставіў плечы постмадэрну, філасофія смяецца з ўсялякіх хайдэгераў, што абмарачыліся ў пагоні за ўласным рэліктава захаваным хвастом, нацыі і не збіраюцца сціцца, а этна-рэлігійныя канфлікты цепляцца альбо палымнеюць. Няма ў свеце анічога новага. Культурная гульня ў падобнай сітуацыі нагадвае выкшталцона-трагікамічную позу страуса. Смешна, але праблемы самі сабою не вырашаюцца. І вырашыць іх можна, як сведчыць практыка, па тэхналогіі свядомасці. Як бы між іншым брукуецца дарога ў пекла, дакладней, у нікуды, у смерць. Гуляючы, можна ўзнесціся і вышэй за смерць, быць "вышэй за гэта", як выражаліся арыстакраты; адно толькі, гэта будзе ўжо нікому нецікава. Не будзе каму пляскаць у далоні, не будзе каму смяяцца апошнім. Свет як тэатр — нежыццяздольны.

Я вітаю філасофію-гульню — менавіта як гульню розуму, як бессвядомую праяву жыцця, як прыгажосць, непатрэбную ў сям'і. Я вітаю філасофскае пазнанне як праяву велічы чалавека, што вылучыўся з прыроды, перарос узрост гульняў, хаця і захаваў прагу да іх. Першая філасофія ўсведамляе сябе праз другую: закон культуры.

Што нашае жыццё — гульня?

Калі так, лупіце саван на анучы (бо смерці няма, людцы), малюйце чорныя дзіркі і квадраты і ў дзіцячым дурэнні скідайце нудотнага Пушкіна с вясёлага карабля сучаснасці. Адрывайцеся напоўніцу.

Калі не — пакіньце ў жыцці месца подзвігу: задумацца — і зразумець.

Між іншым, не кожнаму дадзена.

Анатоль АНДРЭЕЎ

Мікалай ЛОЙКА

Жыў і служыў айцец Мікалай — у грамадзе Мікалай Іеранімавіч Лойка, 1805 года нараджэння — на былой Ігуменшчыне. Яго час і шлях у многім супаў з выпрабаваннямі жыццёвых дарог святара і пісьменніка Плакіда Янкоўскага (1810—1872).

Святар і пісьменнік

Жыў-быў святар...

Мікалай Лойка паходзіў са старажытнага роду на Міншчыне. Скончыў курс Бабруйскага гімназічнага вучылішча, працаваў настаўнікам у Рагачове. Потым атрымаў яшчэ духоўную адукацыю і быў рукапакладзены ў 1827 годзе Полацкім уніяцкім епіскапам Іаанам святаром да Шацкай Ільінскай царквы. З 1834 года прызначаны віцэ-благачынным, а з 1838 года — благачынным Ігуменскім павеце.

Сям'я М. Лойкі і яго жонкі Паўліны была немалой — ажно дзевяць дзяцей. Яна абцяжарвала жыццё святара. З улікам таго а. Мікалаю рашэннем Св. Сінода была прызначана пажыццёвая грашовая дапамога. За сваё служэнне айцец Мікалай атрымаў шэраг узнагарод і адзнак. У 1839 годзе пры пераходзе ў праваслаўе яму нададзена аксамітная фіялетавая камілаўка, а пазней — наперсны крыж. У 1850 годзе а. Мікалай атрымаў протаіерэйскі чын і быў перамешчаны да Ігуменскай Ражаства-Багародзічнай саборнай царквы. Па службе протаіерэй атрымаў у памяць вайны 1853—1856 гадоў бронзавы крыж на Уладзімірскай стужцы і светла-бронзавы медаль на Андрэеўскай стужцы.

Жыццё, здавалася, складвалася. Аднак у 1854 годзе, у перыяд найбольшага ўзвышэння святара па службе, свет грэшны пакінула яго Паўліна. І ўсё далей парушылася. Выявіліся злоўжыванні протаіерэя, за якія яго пазбаўляюць пасады благачыннага і адхіляюць ад удзелу ў перабудове Ігуменскага сабора. За бясконцыя скаргі і пратэсты ён атрымаў непрыхільнасць у акружэнні архіепіскапа Мінскага і Бабруйскага Міхаіла. У хуткім часе протаіерэй Мікалай Лойка пазбаўляецца месца ў Ігуменскай саборнай царкве і яму вызначаецца паводле яго просьбы прыход Дамавіцкай Прэабражэнскай царквы.

У пачатку 1859 года протаіерэй Мікалай зноў перамяшчаецца, на гэты раз да прыходу Грабнёнскай царквы. Тут ён у сваім доме арганізаваў народнае вучылішча, у якім працаваў настаўнікам.

У 1865—1867 гадах разглядвалася судовая справа протаіерэя Мікалая Лойкі аб прачытанні ім прыхаджанам у Грабёнцы мяцежніцкага маніфеста, чым парушалася вернападданая прысяга і абавязак святара. За гэта яму рашэннем царкоўных улад было вызначана адхіленне ад свяшчэннаслужэння з часовым заключэннем яго ў манастыр. Пры гэтым было ўлічана, што ён паходзіў з уз'яднаных святароў.

У 1867 годзе Мікалай Лойка накіроўваецца "для выпрабавання думак" (испытания мыслей) у Пярэмышль-Люцікаў манастыр Калужскай епархіі. Праз год з невялікім ён атрымаў прыход у Спас-Загор'і Малаяраславецкага павета, а ў 1873 годзе вызначаны да гарадской Малаяраславецкай Успенскай царквы. К гэтаму часу сямейства яго ўжо пакінула.

Па непацверджаных звестках М. Лойка памёр у 1880 годзе.

...і пісьменнік

Асоба Мікалая Іеранімавіча Лойкі несумненна яркая, чуллівая і экзальтаваная, адначасова вельмі супярэчлівая, лёгка ранімая. Ён зарэкамендаваў сябе выразна творчай натурай з праявамі пэўнага літаратурнага таленту.

Гэта мы адчулі, працуючы над 136-м царкоўным фондам Нацыянальнага гістарычнага архіва РБ. Досыць высокі літаратурны і нават мастацкі ўзровень перапіскі М. Лойкі не падлягаў сумненню ў здольнасцях аўтара.

У першай палове яго чарговага зваротту, прашэння, рапарта да царкоўнага ці грамадзянскага начальства звычайна ішлі прыўзнятыя развагі па тым ці іншым пытанні з адпаведнай адсылкай да пачуццёвых фактараў, супастаўленняў з пазіцыі дабра і зла, гонару і сумлення. У адрас высокапастаўленай асобы часам гучалі, нягледзячы на яе іншы раз высокі статус, непрыкрытыя папрокі. Толькі поўнасцю аслабаніўшыся ад эмоцый, Мікалай Лойка пачынаў адступаць, каяцца і ўжо больш спакойна выкладаць сутнасць справы. Такім прыёмам ён прадвызначаў для сябе будучае дадатнае рашэнне.

Напрыклад, у лісце да ўладыкі ён пісаў: "...Пераканаўшыся, што для мяне няма аніякай міласэрнасці, ніякай паблажкі, ніякай міласці архіпастырскай, я не павінен болей турбаваць Яго Высокапрасвяшчэнства. Але гінучы чалавек, абцяжараны сямействам, які не можа пераносіць плачу, лямантаў, горкіх слёз цэлага дома, робіцца часам шалёным і хапаецца за ўсё, не ведаючы, за што менавіта хапіцца. Бяру яшчэ раз смеласць апошні раз прасіць даць мне апошнейшае месца. Дайце мне куток, але такі, куды б, пабраўшы маіх дзяцей і на рукі і за рукі, мог бы іх перанесці, бо, як пры апошніх днях майго жыцця, не маю ні вала, ні каня — зусім нічога...".

Альбо з нагоды канфлікта з суседзямі: "У гэта лета, мала займаючыся гаспадаркай, я аднойчы выйшаў з сынам маім агледзець засеяныя палеткі, а за намі беглі два сабакі, якія, убачыўшы ў жыце свіней, кінуліся на іх з брэхам, і калі свіння завішчала, раптам з-за гары паказаўся цэлы статак свіней, раздражнёных, і акружылі нас так, што я і мой сын амаль паспелі ўскочыць на плот..."

Трэба адзначыць, што М. Лойка выдатна валодаў рускай літаратурнай мовай, як і польскай. Быў прыхільнікам і прапагандыстам здабыткаў польскай культуры. Дарэчы, такое былым уніяцкім святарам не забаранялася.

У пошуках спадчыны

Нічога дзіўнага, што Мікалай Лойка яшчэ з дзяцінства сваёй чулай душой далучыўся да багацця вераванняў тутэйшага насельніка. Да канфліктнасці супярэчлівы, ён быў зачараваны нейкімі мройнымі ўяўленнямі, часам вярэдзіў сваю душу выдуманымі сюжэтамі. Будучы падрыхтаваны да пісьменніцкай творчасці змалку, Мікалай Лойка толькі ва ўзросце 50-ці гадоў выявіў сябе на літаратурнай ніве.

Пра Мікалая Лойку, "ліхога вершапісца", што апісаў месца над Волмай пад назвай Красны Бераг, згадвае ў "Слоўніку геаграфічным..." вядомы беларускі краязнаўца Аляксандр Ельскі. Ён даў звесткі пра святара, экс-уніята, аўтара "пацешных вершаў" пра некаторыя ігуменскія мясцовасці і спасылаўся на трэці том добра вядомай даследчыкам "Бібліяграфіі" Эстэррайхера.

Потым у фондах Навуковай бібліятэкі імя Я. Коласа НАН Беларусі нам натрапіўся ксеракс невядомай да гэтага кніжкі М. Лойкі "Чытанне для забавы малых дзетак", выдадзенай на 81-й старонцы ў 1860 годзе ў Мінску ў друкарні Дворца. Пры прыхільным садзеянні дырэктара Навуковай бібліятэкі імя Я. Коласа Наталлі Бярозкінай была атрымана з Санкт-Пецярбурга і копія "Апісання фальварка пад назвай Красны Бераг". Такім чынам была сабрана ўся пакуль што выяўленая літаратурная спадчына М. Лойкі.

Сакрэты народных вераванняў

Сяброў у Мікалая Лойкі было няшмат. У час найвышэйшага душэўнага крызісу ў 1854—1855 гадах яго запрашаў адпачыць у толькі што адбудаваных лясным фальварку Красны Бераг "чалавек вясёлага жыцця" мясцовы памешчык Эдвард Каржанеўскі. Фальварка таго зараз і след прастыў, а вось вёсачка з такой жа назвай і цяпер існуе. Прыгажосць, таемнасць і непаўторнасць амаль дзікай прыроды над ракой Волмай уразілі і захапілі протаіерэя. Рука сама пацягнулася да пяра. Пра той прыродны куток-рай не хацелася гаварыць прозай. Вось і атрымалася вершаванае польскамоўнае апісанне, на якое спасылаўся Ал. Ельскі. У ліпені 1856 года твор быў выдадзены ў Мінску. Сёння гэта каштоўнейшае дакументальна-мастацкае сведчанне пра адышоўшае пасяленне на мяжы Чэрвеньскага і Пухавіцкага раёнаў.

"Чытанка для забавы малых дзетак" напісана ў Дамавіцку, яшчэ адным фальварку пана Каржанеўскага, у 1857-м і выдадзена ў 1860 годзе. Прызначана яна не толькі "для малых дзетак", бо ўстрымлівае сур'ёзную для роздумаў інфармацыю. У выразна павучальным творы змешчаны цікавыя апрацоўкі мясцовых старажытных вераванняў, выкладзеныя ў чатырох "гісторыйках" з дадаткамі.

Трэці па ліку твор мае назву "Мой уласны выпадак" — гэта па сутнасці працяг апісання ўсё тых жа ўражанняў ад фальварка Красны Бераг.

...А дванаццатай ночы на месячны двор фальварка завітала ў карэце пры чатырох конях і пры прыслузе маладая жанчына нямецкага паходжання. Ехала яна з Курляндыі да цесця на Украіну. У Раванічах заблудзілася і трапіла ў Красны Бераг. Гаспадар пачаў частаваць госцю, а яна не шкадуючы адорвала яго рознымі падарункамі — замежнымі вінамі, пярсцёнкамі, грашыма. Потым пайшлі начныя спевы пад фартэпіяна фрывольных рускіх песенек. Пані ў расчуленым стане аддала гаспадару нават сваіх чорных конікаў узамен скрадзеных у яго ў Мінску з адной толькі ўмовай, каб неяк давёз яе да Ігумна.

Але ў аўтара пасля смакавання яе він неспадзявана ўзнялася гарачка. Дама ж раптам ператварылася ў кошку. Знікла недзе ўсё: і коні, і грошы, і прыслуга. Аўтар прыходзіць да высновы: то быў усяго сон, сон хворага чалавека, сон цяжкі і марны. Другая палова твора — развагі, што ёсць сон, а што сапраўднае жыццё. На зямлі ў чалавека ўсё сон, адвечнае сапраўднае жыццё — толькі на небе...

Трэба зрабіць удакладненне, што раней чорт-вядзьмак і ведзьма (менавіта з ёй давялося стрэцца аўтару) у беларусаў атаясамліваліся з асобамі чужога, часцей нямецкага паходжання, прыбранымі ў чужынскае адзенне, з рознымі там цыгарамі-піпкамі, гадзіннікамі-зэгарамі, брыльянтамі-дыяментамі, дукатамі. Чорныя коні — таксама іх коні. Розныя немясцовыя напоі — д'ябальскія напоі. З'явілася-заблудзілася пані-вядзьмарка пад поўнач, калі чэрці якраз і выходзяць на свой баль. Яркі месячык — час іх разгулу. Ён надае ўсяму наваколлю дадатковую таемнасць. Пазбегчы гэтай навалачы магчыма, калі весці прыстойнае жыццё.

Пра вясковыя "дзяды" — кароткае апісанне ўбачанага ў час падарожжа рытуала святкавання беларускіх восеньскіх дзядоў.

Звяртае на сябе ўвагу грунтоўная і змястоўная казка "Пра птушку Ворана-Воранава". Пабудаваныя цалкам на мясцовых казачных уяўленнях учынкі яе герояў перанесены ў штучныя Сатурнаўскае і Уранаўскае каралеўствы. Самі каралі і іх дзеці носяць грэчаскія, італійскія і польскія імёны. Іх паводзіны разглядваюцца аўтарам з пазіцыі высокай маралі. У рэшце рэшт ходам падзей дабро ўганароўваецца, а зло караецца.

Заслугоўвае асаблівай увагі вобраз птушкі Ворана-Воранава. Пры бліжэйшым разглядзе ў яго рысах выразна праступае галоўнае дародавае славянскае бажаство пад назвай Дый (Дзій, Дзіў, Дзіва). У абагульненні гэта птушка верхавод г е н і я ў, сувязная паміж тым (дзе яна знаходзіцца) і гэтым светам. Беларусы вельмі ўшаноўвалі ў сваіх вераваннях птушку Дзіў.

Завяршаюць кніжку загадкі для дзяцей, складзеныя аўтарам у форме вершыкаў, іх усяго трыццаць чатыры. Сюды далучаны яшчэ вершаваныя запрашэнні пакупнікоў (па сённяшняму — рэклама) на набыццё розных прыпраў, прысмакаў, галантарэі, інструментаў, школьных прыналежнасцей...

Такім вось быў гэты неўгамонны святар і пісьменнік. Магчыма, у расійскай высылцы, ва ўмовах некранутай калужскай прыроды, ён прадоўжыў свае сачыненні.

Уладзімір КІСЯЛЁЎ

OPISANIE FOLWARKU,

NAZWANEGO

KRASNYBRZEG,

POBUDOWANEGO 1855 ROKU, MIŃSKIÉJ GUBERNJI W POWIECIE IHUMEŃSKIM PRZEZ OBYWATELA EDWARDA KORZENIEWSKIEGO.

MIŃSK.

W DRUKARNI J. DWORCA.

1855.

Музею старадаўніх народных промыслаў і тэхналогій "ДУДУТКІ" сёлета ў кастрычніку споўнілася 10 гадоў. Гэта адзіны такога кшталту музей не толькі ў Беларусі, але і на ўсёй постсавецкай прасторы, у якім узноўлены народныя рамёствы .

Пад крыламі ветрака



Дзіўнае пачуццё ахоплівае цябе, калі яшчэ з асфальтаванай шашы, якая раптоўна паварочвае з лесу, у полі на высокім узгорку ўбачыш яго... Вятрак! Ён махае крыламі, як нейкая вялізная незямная птушка, а табе на памяць прыходзіць бессмяротны герой іспанскага пісьменніка сярэднявечча Сервантэса Дон-Кіхот, які змагаўся з гэткімі ж ветракамі. І міжволі падумаеш: гэта ж колькі стагоддзяў яму, ветраку? А самім Дудуткам? Цяпер вёска Дудзічы. Ёсць версія, што гэта яна ўпамінаецца ў славутым "Слове пра паход Ігаравы"...

Менавіта з яго, ветрака, і пачынаецца знаёмства чалавека, які трапіў сюды ўпершыню, са знакамітымі "Дудуткамі" — прыватным музеем старадаўніх народных промыслаў і тэхналогій. Напомнім, што ён знаходзіцца ў вёсцы Пціч Пухавіцкага раёна на берагах аднайменнай рачулкі за 40 кіламетраў ад Мінска. Стварыў яго ў 1994 годзе пісьменнік-публіцыст і прадпрымальнік Яўген Будзінас. Так што сёлета ў музея маленькі юбілей. Кіруе ім сёння Віктар Якаўлевіч Сарока.

Узяўшы білет коштам у 9 тысяч (як вам сума?), я разам з чарговымі экскурсантамі лезу па лесвічках у скляпенні ветрака. Назіраю, як млынар засыпае з мяшка зерне ў жорны, як цячэ мука з латка, дзіўлюся на вялізныя прывадныя механізмы (і гэта ўсё круціць вецер). Успамінаю, як у дзяцінстве я гэтак жа лазіў у наш, як мы называлі, занёманскі вятрак, які стаяў на выноснай гары перад поймай. Няма яго даўно, як і іншых па ўсёй Беларусі. А шкада!

У якой-небудзь Галандыі і сёння ветракі прыносяць карысць чалавеку. Яшчэ раз узняўшы галаву і падзівіўшыся на сіметрычныя рухі крылаў ветрака, я за экскурсантамі спускаюся ў нізінку, бліжэй да рачулкі Пціч. Па дарозе на выгане пасецца табун коней, каля буданчыка скачуць разнамасныя трусы. Нас сустракае невялікі шапік. Перад шапікам — шыльда з назвай музея. А ў самім шапіку — сувеніры мясцовай вытворчасці: кераміка, вырабы з дрэва, металу... За прылаўкам гандлюе маладая дзяўчына, тутэйшая красуня. У дворыку мноства кветак, стаяць драўляныя скульптуры. Па сцяжынцы, выкладзенай каменнем, нас вядзе экскурсавод Наталля Сялязнёва да рачулкі, на беразе якой віднеецца дзіўнае збудаванне: печка, бочкі, трубкі. Над ім навес, пад якім доўгі драўляны стол. Падышоўшы бліжэй, заўважаю, як з адной з бочак цурчыць чысты струменьчык. Што б вы падумалі адразу? Ну, магчыма, простая вада для піцця. А экскурсавод вам скажа: вада, але толькі вогненная. Бровар, на які законна атрымана ліцэнзія. Старадаўні промысел? Вядома ж. Беларускія магнаты гэтым промыслам займаліся. А што ўжо казаць аб простым людзе. Да сёння нелегальна дзейнічае гэты "вогненны бровар". Кожны экскурсант пры жаданні, заплаціўшы грошы, можа прадэгуставаць моц вогненнага напою, закусіўшы бутэрбродам з чорнага хлеба, мёду і скрыліка салодкага агурка.

Ад бровара з адпаведным настроем — яго стварае не толькі дэгустацыя, а проста сама экзотыка — экскурсанты рушылі аглядаць па чарзе цэхі-майстэрні.

Сыраварня стаіць першай. Заходзім. Перад намі абсталяванне: ціскі, клінкі, маслабойкі... Тое, якім карысталіся нашы продкі. Праўда, тут яно трошкі мадэрнізавана. Як тая поўня, "даспяваюць" сыры...

А вось і ганчарны цэх. На паліцах — гатовыя керамічныя вырабы: вазачкі, кубкі, розныя сувеніры. Антон Пракаповіч (так сябе ён назваў) прыехаў з Івянца, у якім амаль 50 гадоў адпрацаваў на фабрыцы. На ганчарным крузе ён дэманструе нараджэнне чарговага глячыка. Другі, яшчэ зусім малады хлопец, робіць маленькай дзяўчынцы-экскурсантцы свісцёлку-птушачку.

Бондарскі цэх-майстэрня сустрэў свежым пахам дрэва, стружак. Тут стаяць розных аб'ёмаў бочкі, кадушкі, дзежы, ражкі, цэбры. Над асьмінай-бочкай завіхаюцца два майстры: драўляныя клёпкі сцягваюць жалезнымі абручамі. У асьміну нашы дзяды і прадзеды ссыпалі збожжа, захоўвалі яго на зіму.

У кавальным цэху заінтрыгаваў кавальскі мех. Экскурсанты самі могуць з ім папрацаваць — раздзьмуць горан. Што я і раблю, успомніўшы нашу дзедаўскую кузню: колькі разоў я, малы, цягаў за ручку кавальскага меха! Як радаваў распалены горан! Пасярэдзіне кузні — кавадла. На сценах — падковы, на зямлі — чыгункі, конаўкі, патэльні, рознае начынне.

Выйшаўшы з кавальскага цэха, на алеі здзіўляюць рарытэтныя аўтамабілі — ад "Чайкі", "ЗіМа" да "эмак" і "вілісаў", якія выстраіліся ў рад. Сеўшы ў іх, ты можаш адчуць сябе на нейкі час "генсекам" ці якім-небудзь палкоўнікам ваеннага часу.

У сталоўцы-карчме нас частуюць толькі што спечанымі ружовымі дранікамі са смятанай. Скажу вам: смаката! Такія еў, здаецца, толькі ў далёкім дзяцінстве, згатаваныя ўмелымі рукамі мамы.

Не ўсё тут паспеў пабачыць. Але мой аповед дапоўніць загадчыца музейнай часткі Тамара Іванаўна Станкевіч.

— "Дудуткі" — гэта музей рамёстваў, дзе кавалак дрэва, гліны, металу ажываюць на вашых вачах. А яшчэ — музей быту, матэрыяльнай культуры, тэхналогій. За сталом хлебасольных гаспадароў можна паспытаць плады іх працы, адчуць іх гасціннасць, пачуць песні, якія спяваюць тут здаўна.

Першае вы ўсё бачылі, а вось ткацтва, салома-лозапляценне мы толькі асвойваем. Хутка экскурсанты ўсё гэта ўбачаць на свае вочы. Другі паверх майстэрняў аддадзены пад экспазіцыі. Там вельмі цікавыя робім выставы народных промыслаў. Існуе ў нас Купальская паляна. Праводзім на ёй абрадавыя святы — ад Раства да дажынак. Тут гучаць усе абрадавыя песні. Сумесна з Пухавіцкім аддзелам культуры арганізуем фэсты, вернісажы, пленэры. У час іх правядзення ў нашай краме можна заўсёды купіць тутэйшыя сувеніры — вырабы ганчароў, кавалёў, майстроў салома-лозапляцення.

...Завяршаючы экскурсію, я крочу ў выкшталцоны домік адміністрацыі. Заходжу ў кабінет дырэктара. Віктар Якаўлевіч Сарока аказаўся на месцы. Гутарым з ім.

— Раскажыце, калі ласка, што для вас "Дудуткі" і што змянілася ў музеі за 10 мінулых гадоў?

— "Дудуткі" для мяне — гэта цэлы комплекс, якім трэба штодзённа кіраваць і забяспечваць яго. У музеі працуюць 80 чалавек. Штодзённа прымаем, асабліва летам, па 200—300 экскурсантаў. У нас дзейнічае эканамічная формула: музей — бізнес — турызм. Расшыфруйце яе і вам усё стане зразумела. А што змянілася за 10 гадоў? Рэканструявалі старыя будынкі, пабудавалі гасцініцу, карчму, канюшню на 22 галавы, вальеры для экзатычных птушак — фазанаў, паўлінаў, індакачак. Ёсць у нас буслы, індыкі, трусы, дзікі-вепрукі... Так што, бачыце, гаспадарка немалая. А калі дадаць, што мы расшырылі сельгасугоддзі, то працы хапае...

Існуе і адна праблема: цяжкавата да нас дабірацца. Мяркуйце самі: да бліжэйшага прыпынку электрычкі — 5 кіламетраў, рэйсавага аўтобуса — 4. Хацелася б, каб маршрут рэйсавага аўтобуса з Мінска праходзіў праз "Дудуткі". Ды і работнікам ДАІ варта было б паставіць на дарогах указальнікі з надпісам: "ДУДУТКІ". А то вось вы ехалі, а ці бачылі ўказальнікі? Экскурсанты ўвесь час распытваюць у тутэйшых людзей...

Сапраўды... У маіх руках шыкоўна выдадзены каляровы праспект, які расказвае пра "ДУДУТКІ". Там ёсць выдатныя рэкламныя ўказальнікі. Каб я меў права, я напісаў бы на абочынах дарог, якія вядуць сюды: "ДУДУТКІ — рамантычнае падарожжа ў мінулае і вяртанне ў заўтра; "ДУДУТКІ" — музей вобраза жыцця, дзе вы акунецеся ў свет прыгод, гульні" і г.д. Можна не сумнявацца, што экскурсантаў было б яшчэ больш. Як за мяжой кажуць, рэклама — гэта ўсё! А "ДУДУТКІ" яе заслугоўваюць несумненна.

Яўген ХВАЛЕЙ

ЗАХАРАВА, 19

Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Літаратура і Мастацтва»

прымае да разгляду:

выдавецкія праекты самай шырокай тэматыкі;

выканае ўвесь спектр рэдакцыйна-выдавецкіх паслуг;

арганізуе рэкламу і прэзентацыю выданняў.

Вул. Захарава, 19, тэл.: 284-66-71.

Выдавецкая ліцэнзія — ЛВ № 570 ад 23 кастрычніка 2002 года, выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Беларуская дзяржаўная акадэмія мастацтваў

аб'яўляе конкурс на замяшчэнне пасад прафесарска-выкладчыцкага складу:

Загадчык кафедры скульптуры — 1

Загадчык кафедры касцюма і тэкстылю — 1

Дацэнт кафедры малюнка — 1

Дацэнт кафедры манументальна-дэкаратыўнага мастацтва — 1

Дацэнт кафедры гісторыі і тэорыі мастацтваў — 1

Дацэнт кафедры сцэнічнай мовы і вакала — 1

Дацэнт кафедры майстэрства акцёра — 1

Дацэнт кафедры рэжысуры — 1

Дацэнт кафедры кінатэлемастацтва — 1

Старшы выкладчык кафедры гуманітарных дысцыплін — 1

Старшы выкладчык кафедры касцюма і тэкстылю — 1

Старшы выкладчык кафедры графічнага дызайну — 2

Старшы выкладчык кафедры малюнка, жывапісу, скульптуры — 2

Старшы выкладчык кафедры майстэрства акцёра — 1

Старшы выкладчык кафедры сцэнічнай мовы і вакала— 1

Старшы выкладчык кафедры рэжысуры — 2

Выкладчык кафедры гуманітарных дысцыплін — 1

Тэрмін падачы заяў — адзін месяц з дня апублікавання аб'явы. Заявы і дакументы, згодна палажэння аб конкурсах, падаваць на імя рэктара акадэміі па адрасе: 220012, г. Мінск, пр. Ф. Скарыны, 81, аддзел кадраў: тэл. 232—77—34

Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова "Літаратура і Мастацтва" выказвае глыбокае спачуванне намесніку начальніка інфармацыйна-аналітычнага упраўлення Міністэрства інфармацыі РБ МЯШЧЭРСКАЙ Валянціне Віктараўне ў сувязі з трагічнай смерцю **дачкі Наталлі.**

Лістапад. Час міласэрнасці

На пачатку лістапада беларусы адзначаюць традыцыйны дзень памяці — Дзмітрыеўскую суботу, Дзяды.

Позняя восень... Пад нагамі ціха шапаціць апалае лісце, над галавою расхінула свае шаты шэрае неба, а халодны вецер час ад часу зрывае з дрэў апошнюю лістоту. Душу паволі агортвае ціхі сум, калі глядзіш на тое, што яшчэ так нядаўна нарадзілася, а цяпер — памірае. Таму восень — асаблівы час, калі думкі адрываюцца ад штодзённых спраў і позірк накіроўваецца ў нябачную далеч вечнасці. Невыпадкова з даўніх дзён нашы продкі менавіта позняй восенню прыходзілі на могілкі, каб прыбраць іх і ў маўклівай цішы памаліцца за душы людзей, што знайшлі тут апошні прытулак.

Але яшчэ зусім нядаўна, гадоў дваццаць таму, тагачасныя ўлады ўсімі магчымымі сродкамі імкнуліся вынішчыць старадаўні звычай: ён жа сведчыў, што чалавечае жыццё не скончваецца на зямлі і што кожны чалавек мае моцную сувязь з душамі сваіх памерлых продкаў. Таму, напэўна, сёння так шмат занядбаных могілак, хоць на помніках можна прачытаць словы любові і вялікага смутку па нябожчыку.

Спачуванне да гэтых душаў, пра якія ніхто не дбае на зямлі, а таксама жаданне ўласным прыкладам паказаць любоў да бліжніх, нават да тых, хто паснуў ужо навечна, кіруе парафіяльнай моладдзю сталічнага Архікатэдральнага касцёла, калі яна ў Дзень задушны наведвае мінскія Кальварыйскія могілкі. Гэтыя маладыя людзі прыбіраюць хаця б частку тэрыторыі, а ўвечары разам са святаром спяваюць нешпары, просячы аб збаўленні для душаў памерлых. У такія хвіліны насамрэч адчуваецца сувязь між небам і зямлёй, між жывымі і тымі, хто адышоў ад нас навечна. Разумееш, як добра клапаціцца не толькі пра блізкіх і знаёмых, але і пра тых, каго не ведаеш і хто мае патрэбу ў тваёй малітве. Бо ўсё ў гэтым свеце ў раўнавазе. Залатое правіла кажа нам: "І вось усё, што хочаце, каб рабілі вам людзі, тое і вы рабіце ім"(Мц.7,12). На якую ж памяць і клопат нашчадкаў можна спадзявацца, калі сам не дбаеш пра сваіх продкаў?

Таму ў цішыні роздуму раўды, як часта тое, для чаго жывеш, насамрэч з'яўляецца такім часовым і нетрывалым... Тое ж, што можа сапраўды стаць тваім скарбам у вечнасці, старанна абмінаеш.

А гэтае наведванне могілак і з'яўляецца часткожны малады чалавек падыходзіць да магілкі і запальвае ля яе свечку — сімвал памяці і малітвы, якая да таго ж хоць крышачку асвятляе навакольную цемру. І, спадзяюся, не толькі вечаровую цемру на вуліцы, але і цемру нашых дзён, дзе так часта абыякавасць займае месца, якое павінна належаць любові і міласэрнасці.

Тут, на могілках, нельга не задумацца пра каштоўнасці чалавечага жыцця, пра блізкасць вечнасці. "Бо не ведаеце, калі прыйдзе час..."(Мк.13,33). Так, сапкай нашага духоўнага здабытку, які ніхто не зможа адабраць ці знішчыць. Калі клапоцішся пра душу іншага чалавека, чыніш дабро, таксама клапоцішся і пра сваю душу. Менавіта ў гэтым яскрава бачыцца непарушная сувязь між жывымі і памерлымі, якая трывае вечна, але асаблівым чынам праяўляецца ў гэтыя халодныя і шэрыя дні позняй восені, надаючы ім незвычайную прыгажосць.

Ларыса ДАРАШЭНКА

Фота К. Дробава і В. Цуранава





ІДЗЕ ПАДПІСКА НА IV КВАРТАЛ 2004 ГОДА!

«Літаратура і мастацтва»
Індывідуальная (індэкс — 63856)
на 1 месяц — 2600 руб.
на 3 месяцы — 7800 руб.
Ведамасная (індэкс — 63857)
на 1 месяц — 4100 руб.
на 3 месяцы — 12 300 руб.
Льготная (індэкс — 63880)
на 6 месяцаў — 16 800 руб.

"Маладосць"
Індывідуальная (індэкс — 74957)
на 1 месяц — 2700 руб.
на 3 месяцы — 8100 руб.
Ведамасная (індэкс — 00137)
на 1 месяц — 3900 руб.
на 3 месяцы — 11 700 руб.
Льготная (індэкс — 00731)
на 6 месяцаў — 16 800 руб.

"Полымя"
Індывідуальная (індэкс — 74985)
на 1 месяц — 2600 руб.
на 3 месяцы — 7800 руб.
Ведамасная (індэкс — 00141)
на 1 месяц — 3600 руб.
на 3 месяцы — 10 800 руб.
Льготная (індэкс — 00727)
на 6 месяцаў — 16 800 руб.

"Всемирная литература"
Індывідуальная (індэкс — 74863)
на 1 месяц — 2600 руб.
на 3 месяцы — 5200 руб.
Ведамасная (індэкс — 00135)
на 1 месяц — 3600 руб.
на 3 месяцы — 7200 руб.
Льготная (індэкс — 00729)
на 6 месяцаў — 8400 руб.

"Нёман"
Індывідуальная (індэкс — 74968)
на 1 месяц — 2600 руб.
на 3 месяцы — 7800 руб.
Ведамасная (індэкс — 00238)
на 1 месяц — 3600 руб.
на 3 месяцы — 10 800 руб.
Льготная (індэкс — 00728)
на 6 месяцаў — 16 800 руб.

ЛіМ

Выходзіць з 1932 года
У 1982 годзе ўзнагароджаны ордэнам Дружбы народаў

ГАЛОЎНЫ РЭДАКТАР
Анатоль КАЗЛОЎ

Рэдакцыйная рада:
Святлана БЕРАСЦЕНЬ,
Леанід ГАЛУБОВІЧ,
Наталля ДЗЯНІСАВА,
Віктар КАВАЛЁЎ,
Вольга КУРТАНІЧ,
Віктар ПАТАПЕНКА — намеснік галоўнага рэдактара

АДРАС РЭДАКЦЫІ:
220005, Мінск,
вул. Захарава, 19

ТЭЛЕФОНЫ:
галоўны рэдактар — 284-66-73
намеснік галоўнага рэдактара — 284-66-73

АДДЗЕЛЫ:
публіцыстыкі — 284-79-65
пісьмаў і грамадскай думкі — 284-81-53
паэзіі, літаратурнага жыцця, крытыкі і бібліяграфіі — 284-44-04
прозы — 284-66-73
музыкі, тэатра, кіно і выяўленчага мастацтва — 284-81-53
бухгалтэрыя — 284-66-72
Тэл./факс — 284-66-73

Электронны адрас:
e-mail: minsk@lim.by

Адрас у Інтэрнеце — www.lim.by

Пры перадруку просьба спасылацца на "ЛіМ". Рукапісы рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе. Пазіцыя рэдакцыі можа не супадаць з меркаваннямі і думкамі аўтараў публікацый.
Набор і вёрстка камп'ютэрнага цэнтра РВУ "Літаратура і Мастацтва"

Выходзіць раз на тыдзень па пятніцах

Друкарня Рэспубліканскага унітарнага прадпрыемства "Выдавецтва "Беларускі Дом друку"
г. Мінск,
пр. Ф. Скарыны, 79

Індэкс 63856 Наклад 2454
Умоўна друк. арк. 3,72
Нумар падпісаны ў друк 20.10.2004 у 11.00

Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь
Выдавец:
Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова "Літаратура і Мастацтва"

Рэгістрацыйнае пасведчанне № 715
Заказ — 1558

Д 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12